№ 1 (647) 5 студзеня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Топ-15 самых сэксуальных спартовак свету

Старонка 9









### У НУМАРЫ

**Беларус з Федэральнай рэзервовай службы**
Прафесар эканомікі Ельскага ўніверсітэта Міхаіл Голасаў адказаў на пытанні «Нашай Нівы». **Старонка 4.**

**Сяргей Крывец**
стаў 10-м у «Леху». Гутарка з футбалістам. **Старонка 6.**

**Драма бетоншчыка**
які працаваў гастарбайтэрам у Маскве. **Старонка 7.**

**Даўняя спрэчка пра малако**
Пра сувязі генетыкі і харчавання на прыкладзе беларусаў піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

**У кожнай жанчыны ёсць свой ваўкалак**
Піша Марыя Роўда. **Старонка 13.**

**Горы: ад Сілічаў да Наваградка**
Самы час выбрацца на выходныя пракаціцца з ветрыкам. **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Расія зноў за сваё

Новы год пачаўся нафтавай вайной з Расіяй. Масква няўмольна дабіваецца стратэгічнай мэты: апанавання прывабных прадпрыемстваў Беларусі. **Старонка 3.**



Ігар Сечын — віцэ-прэм'ер Расіі, адказны за энергетычны сектар.

### СКАНДАЛ

## Наклеена ў Беларусі



Этыкетка «Інтэграла» імгненна ператварае імпартныя маніторы ў айчынныя. І робіць даражэйшымі на 55 даляраў. **Старонка 4.**

# Святая задача Лукашэнкі

Прэс-канферэнцыяй перад Новым годам Аляксандр Лукашэнка фактычна распачаў новую прэзідэнцкую кампанію.

Невыпадкова адным з галоўных абяцанняў кіраўніка дзяржавы было істотнае павелічэнне заробку. «Сярэдняя заработная плата цягам года павінна дасягнуць 500 даляраў. Гэта задача святая. Пенсіі павінны вырасці на 9—10%», — зазначыў А.Лукашэнка. А пасля гэтага адразу дадаў: «Праз год прэзідэнцкія выбары. Таму мы павінны будзем бегчы хутчэй, чым можам».

Сярэдні налічаны заробак у Беларусі ў лістападзе склаў 1 012 903 рублі, гэта 352 даляры. Заробку ў 500 баксаў можна дасягнуць толькі калі ў Беларусі не будзе дэвальвацыі рубля, а таксама пры дапамозе чарговых крэдытных уліванняў у эканоміку.

Няма сумневаў, што Лукашэнка будзе рабіць усё магчымае перад выбарамі, каб сітуацыя ў эканоміцы заставалася стабільнай. Дарэчы, сярэдні заробак у Польшчы цяпер складае 1100 даляраў.

**Заробкі ў Беларусі застаюцца ў 3 разы ніжэйшымі, чым у Польшчы.**

Кіраўнік краіны выказаў спадзяванне, што росту цэнаў у Беларусі сёлета не будзе. «Калі ёсць ажыўленне ў эканоміцы і мы прайшлі гэтае дно, то негатыўныя працэсы павялічвацца не павінны, у тым ліку і рост цэнаў», — зазначыў Лукашэнка.

Але ці не з'есць інфляцыя павелічэнне заробкаў? «Хацелася б, каб не з'ела», — сціпла адказаў кіраўнік дзяржавы.

Лідэр Беларусі прызнаўся, што яго засмучае найбольш, і хто ва ўсім вінаваты. «Вядома, я вельмі перажываў сітуацыю ў эканоміцы. Я думаў, што дай мне трыпяць гадоў і я пакажу беларусам, што такое еўрапейская дзяржава. Заплюшчваў вочы і бачыў аграгарадкі з басейнамі. Такога больш нідзе няма. І тут — на табе! Ляснуў гэты крызіс. Гэта больш за ўсё мяне засмучае».

**Працяг на старонцы 2.**

# Нецвярозы Дзед Мароз рэгуляваў рух на адной з вуліц Мінска

**Міліцыя, пажарныя і медыкі падвялі вынікі святаў.**

380 тысяч беларусаў узялі ўдзел у масавых гуляннях у навагоднюю ноч. У Мінску глядзець святочны феерверк прыйшлі 23 тысячы чалавек. За парадкам на святы сачылі каля 10 тысяч супрацоўнікаў міліцыі, у Мінску — тысяча.

Святочную ноч у выцвярэзніку правялі 23 чалавекі, з іх 7 — у Мінску. Сярод кліентаў гэтай установы апынуўся нецвярозы мужчына ў касцюме Дзеда Мароза, якога затрымалі на адной з вуліц сталіцы пры спробе арганізаваць дарожны рух, паведаміў першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МУС Аляксандр Барсукоў падчас постсвяточнай прэс-канферэнцыі.

**Святочную ноч у выцвярэзніку правялі 23 чалавекі, з іх 7 — у Мінску.**

А.Барсукоў адзначыў эфектыўнасць працы ў сферы абарачэння піратэхнічных прыстасаванняў. Калі летась было канфіскавана каля 500 тысяч адзінак піратэхнікі, то сёлета ўжо больш за 2,6 млн. Як вынік — сёлета пацярпелых ад выбухаў было 15 чалавек, летась — 56. Тым не менш, петарды і феерверкі працягваюць рабіць шкоду: у Мінску феерверк трапіў у акно і ў кватэры здарыўся пажар.

Ад пераахаладжэння ад 24 снежня да 3 студзеня загінулі 10 чалавек, пацярпелі 145, былі шпіталізаваныя 68. У Мінску за святы былі зафіксаваныя 26 алкагольных атручванняў, па краіне — 107.

У навагоднюю ноч было затрымана 158 нецвярозых кіроўцаў. Адзін чалавек загінуў у ДТЗ у Кобрынскім раёне.

**Сямён Печанко**

## УЛАДЗІМІР АРЛОЎ

НАВАГОДНІ ВЕРШ

пасля тваіх званкоў мяняецца надвор'е
капеж звініць альбо кладзецца снег
залеву або знічку неба дорыць
і воўк лапландскі паскарае бег

пасля тваіх званкоў каты пяюць на дахах
самнамбулы іх кормяць з цёплых рук
і сэрцы пачынаюць гулка тахкаць
у вожыкаў з-пад Прагі і Прылук

пасля тваіх званкоў спыняюцца таксоўкі
трамвай ідзе з дэпо якраз туды
дзе прадстаўнік азёрнай школы Колрыдж
нам налівае вогненнай вады

пасля тваіх званкоў вяртаецца надзея
і суіцыду нехта кажа бай
растуць валютаў курсы а зладзейкі
замест кішэняў лезуць на tut.by

мой Божа! Мы сусвет народзім новы
ў сваіх абдымках... Ты — багаславі!
мы вынайдзем для закаханых мову
са смеху стогнаў слёзаў і любві

мы ўлежнымі пабудзем з гэтай поўняй
але пад коўдрай хопіць і турбот
каб закахана-беларускі слоўнік
у друк аддаць пад самы Новы год.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уладзімір Арлоў**

**майстар гістарычнае прозы, іранічны эсэіст і адначасова паэт. Філіграннае валоданне стылем і сакавіта-грубаваты гумар зрабілі яго адным з самых папулярных пісьменнікаў краіны. Аўтар хрэстаматыйнай кнігі «Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя». Нядаўна выдаў кнігу паэзіі — «Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся».**

# Пётр Мамонаў у Мінску



5 студзеня ў Мінску выступіць адметны актор і музыка Пётр Мамонаў. Яскравы прадстаўнік расійскага інтэлектуальнага рока, адзін з заснавальнікаў гурта «Звуки Му». Культурны герой: узгадаем роль запойнага саксафаніста ў «Таксі-блюзе» Паўла Лунгіна і гандляра наркотыкамі, зласвеснага блазна, у «Игле». І вось цяпер выканаўца няпростай ролі Івана Жахлівага ў гістарычнай драме «Цар». Такім чынам, 5 студзеня, к/з «Мінск», Пётр Мамонаў з праграмай «Даўнавата мы цябе не бачылі». У імпрэзе — песні з рэпертуару «Звуки Му», урыўкі са спектакляў. Пачатак а 19-й.

**ЛК**

## СЦІСЛА

### «Беларуськалій» — дойная карова ўрада

Пастановай ад 26 снежня ўрад сабраў з «Беларуськалія», дзвюх нафтавых кампаній і чыгункі $290 млн у Фонд нацыянальнага развіцця. Найбольшая нагрузка лягла на калійнікаў — з іх папрасілі $245 млн. Агульныя адлічэнні «Беларуськалія» за год склалі $482 мільёны.

### На праваслаўнае Раство да +2°С

Да 6 студзеня пратрымаецца мароз. Будзе ісці снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу — мінус 7—14°С, днём мінус 1—8°С. 7 студзеня захаваецца хмарнае надвор'е з мяцеліцай і галалёдам, толькі сцяплее — да —4+2°С удзень.

### Недарэчная смерць на Новы год ад рук жонкі

А 4-й раніцы 1 студзеня ў адной са сталічных клінік памёр 49-гадовы беспрацоўны мінчук. Дома, падчас сваркі, яго штурхнула жонка, ён упаў на шкленне міжпакаёвых дзвярэй. Шкло прабіла мужчыну грудзі. Жанчына затрыманая.

### Нацбанк выпусціў манету ў гонар Хруцкага

Манета прастакутная, на пярэднім баку размешчаны фрагмент карціны мастака Івана Хруцкага «Партрэт невядомай». На адваротным — выява самога мастака. Манета адбітая ў Польшчы накладам 4000 штук.

### Хакеіст Грабоўскі зламаў руку

Форвард «Таронта» і зборнай Беларусі Міхаіл Грабоўскі выбыў на шэсць тыдняў, зламаўшы запясце ў матчы супраць «Калгары» (1:3). Зараз Грабоўскі прапусціць Алімпіяду ў Ванкуверы.

**СМ; ЯМ**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

А.К. з Іўеўскага раёна.
Юрыю Р. з Лідскага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Дзмітрыю Г. са Столінскага раёна.
П.К. з Мастоўскага раёна.
Віктару Д. з Капыльскага раёна.
Аляксандру Д. з Карэліцкага раёна.
Алене Дз. з Навагрудскага раёна.
Мікалаю Ш. з Салігорскага раёна.
Л.Ш., Людміле П., Святлане Ш. з Віцебска.
Вользе Ж., Іне С., В.Д., Уладзіміру Я. з Барысаўскага раёна.
Алесю Б., Сяргею В. з Баранавіцкага раёна.
А.Г. з Кіраўскага раёна.
Юрыю Г., Т.В., С.В., Наталлі Б., Г.С., І.С., Галіне Л., С.К. з Гродна.
А.П. з Брэста.




# Сацапытанне: Лукашэнка вярнуўся на дакрызісны ўзровень

Якія праблемы беларусы лічаць найцяжэйшымі — высвятляў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў. У апытанні ўзяло ўдзел 1514 чалавек.

Эканамічны крызіс, які, паводле словаў Лукашэнкі, павінен быў «нас загартаваць», стаў праблемай нумар адзін для беларусаў.

81,3% апытаных 2 снежня 2009 г. лічыць, што беларуская эканоміка знаходзіцца ў крызісе, прычым для 41,8% крызіс «адбіваецца самым сур'ёзным чынам на паўсядзённым жыцці сям'і».

28,7% на працягу апошніх 12 месяцаў сутыкаліся з затрымкай заробку або пенсіі (19% — некалькі разоў альбо штомесяц), ад 54% да 61% рэспандэнтаў за гэты ж перыяд даводзілася скарачаць выдаткі.

Найбольш вострай праблемай большасць назвала рост цэн.

Не дзіва, што большасць лічыць, што іншыя краіны лепей вядуць барацьбу з эканамічным крызісам, чым Беларусь (42,1% vs 30,4%). А тое, што беларуская эканоміка знаходзіцца ў крызісе лічаць следствам эканамічнай палітыкі кіраўніцтва (51,6%).

Але не варта пераацэньваць пратэстны патэнцыял гэтых пачуццяў: калі б заўтра адбыліся выбары прэзідэнта , 42,5% рэспандэнтаў прагаласавалі б за Лукашэнку (за Мілінкевіча — 4,3%, Казуліна — 2,4%).

На пытанне: «Калі ў Вашым горадзе (раёне) адбудуцца акцыі супраць пагаршэння эканамічнага становішча, ці гатовыя Вы ўзяць у іх удзел?» станоўчы адказ далі 14,2%. Гэта на 3,7% менш, чым у сакавіку 2008 г.

Падрабязныя вынікі апытання можна пабачыць на сайце iiseps.org.

**Настасся Шамрэй**




# Святая задача…

**Працяг са старонкі 1.**

Наконт павелічэння замежнай пазыкі Лукашэнка сказаў наступнае: «Калі прадпрыемствы нармальна працуюць, то яны здольныя вярнуць крэдыты. Мы не хочам залезці ў даўгі настолькі, каб не вылезці».

Разам з тым, ён апраўдваўся, што пазыкі — неабходная мера, каб канчаткова не загнаць беларускую эканоміку ў кут.

**Лукашэнка «заплюшчваў вочы і бачыў аграгарадкі з басейнамі».**

Што датычыць павелічэння мытаў на аўтамабілі, то Лукашэнка пачаў абурацца, што Беларусь пачынаюць ператвараць у звалку еўрапейскага хламу.

«Дзярмо сталі рабіць, нават у Германіі. Я страшна люблю аўтамабілі. Але ці варта аддаваць такія шалёныя грошы за патрыманыя машыны? І мы ўвозім гэты хлам, а не, каб паставіць жорсткія бар'еры. І я вінаваты ў гэтым. Мы паспрабавалі з «Фордам», з «Самандам» нешта стварыць. Малы рынак, не хочуць яны. Нам трэба ўсё ж паставіць недзе заводзік і кляпаць гэтыя аўтамабілі», — сказаў А.Лукашэнка.

Тым не менш, наконт прэзідэнцкіх выбараў дзейсны кіраўнік дзяржавы «не напружваецца». «Будзе нармальна развівацца эканоміка, выканаем мы тое, што абяцалі, людзі падтрымаюць дзейную ўладу, дзейнага прэзідэнта, — сказаў ён. — Не будзе гэтага — будуць іншыя людзі».

**Зміцер Панкавец**

# Пятро Марцаў: Засумаваў без мяне Лукашэнка

Падчас прэс-канферэнцыі 30 снежня Лукашэнка шмат разоў успомніў рэдактара «Белорусской деловой газеты» Пятра Марцава. Чым абгрунтаваная такая ўвага з боку кіраўніка дзяржавы?

**«Наша Ніва»: Як так выйшла, што прэс-канферэнцыя фактычна пераўтварылася ў дыялог Лукашэнкі з Марцавым?**

**Пятро Марцаў:** Не было ніякага дыялога. Мяне Лукашэнка ўспамінаў і да месца, і не да месца. Можа, быў рады бачыць. Апошні раз у падобных мерапрыемствах удзельнічаў у 1997 годзе. Засумаваў вось без мяне кіраўнік дзяржавы.

**«НН»: А Вам праз гэта было няёмка ці, наадварот, прыемна?**

**ПМ:** Ды ніяк. Проста Лукашэнка дэманстраваў аратарскія прыёмы. Большасць пытанняў была па сацыяльна-эканамічнай тэме. Гэта і зразумела. А вось сур'ёзных палітычных, біржавых пытанняў не было. І вось, вылучаючы некага з залы, увесь час звяртаючыся да яго, ён спрабаваў разварушыць публіку. Каб быў меншы досвед, то палез бы ў дыскусію.

**«НН»: А чаму «БДГ» паклікалі на падобнае мерапрыемства пасля такой вялікай паўзы?**

**ПМ:** Шчыра скажу, што не ведаю. Можа, гэта ў сувязі з дыялогам уладаў з незалежным грамадствам. Звярнула ўвагу, што кіраўнік краіны недарэчна змяшаў мяне з апазіцыяй, з выбарамі. Я ў ягоным разуменні атаясамліваўся з апазіцыяй.

**«НН»: А якія ўвогуле ўражанні пакінула прэс-канферэнцыя?**

**ПМ:** Прэзідэнт адказваў шчыра, адкрыта. Пытанні ж былі вялыя, сумныя. Цяжкавата было ўсё гэта ўспрымаць. Я лічу, што трэба прэс-канферэнцыі і пытанні рыхтаваць. Нічога кепскага, што пытанні будуць ведаць загадзя. Абы было цікава.

**Гутарыў ЗП**

### КАМЕНТАР

**На прэс-канферэнцыі Лукашэнкі не было ніводнага СМІ, які яго адкрыта крытыкуе**

Маючы дыктатарскую ўладу, кіраўнік дзяржавы баіцца найменшай крытыкі.

На навагоднюю сустрэчу да Лукашэнкі не запрасілі «Нашу Ніву». Не было таксама самай тыражнай незалежнай газеты «Народная воля», самага папулярнага навіннага выдання Белнэта Charter97.org.

Не запрасілі таксама радыё «Свабода», ТВ «Белсат», Еўрарадыё. І сярод мясцовых выданняў таксама не запрасілі ніводнага з тых, якія наважваюцца Лукашэнку адкрыта крытыкаваць. Ніводнага!

Калі і запрасілі недзяржаўных, дык толькі тых, хто ад змусу (рэгіяналы) ці праз фармат (агенцтва БелаПАН) асабіста Лукашэнку не крытыкуюць.

Кіраўнік дзяржавы, маючы дыктатарскую ўладу, баіцца найменшай крытыкі.

Гэтая прэс-канферэнцыя паказала, якога тыпу плюралізм хоча трымаць Лукашэнка. Такі, пры якім бы ніхто ані слоўцам не ставіў пад пытанне ўладу ягонага клана. І курс, які гэты клан рэалізуе.

**Барыс Тумар**

# Абліў Леніна з асаблівым цынізмам

29—30 снежня ў судзе Навагрудскага раёна адбываўся разгляд крымінальнай справы супраць сябра аргкамітэта Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Юрася Казака.

Уночы 7 лістапада хлопец абліў зялёнай фарбай бюст Уладзіміра Леніна, што стаіць на цэнтральнай плошчы Наваградка. Казак прызнае, што сапраўды гэта зрабіў. Супраць яго завялі справу за пашкоджанне помніка архітэктуры. У матэрыялах справы гаворыцца, што хлопец абліў Леніна з асаблівым цынізмам.

Дзяржаўны абвінаваўца запатрабаваў для Казака 225 базавых велічынь штрафу, гэта амаль 8 мільёнаў рублёў. Прысуд будзе вынесены 11 студзеня.

**«Наша Ніва»: Юрась, раскажыце пра сябе.**

**Юрась Казак:** Нарадзіўся ў 1984 годзе ў Наваградку. Вучыўся ў Навагрудскім сельскагаспадарчым каледжы на агранома. Пасля адпрацаваў два гады па размеркаванні ў калгасе. Адначасова паступіў на завочнае ў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт, які і скончыў. Цяпер працую індывідуальным прадпрымальнікам, займаюся ўсталёўваннем дзвярэй.

**«НН»: А ў БХД як трапілі?**

**ЮК:** Праз царкву. Я ўжо сем гадоў з'яўляюся парафіянінам царквы «Новае пакаленне». Дзесьці год назад мы ўсёй царквой прыйшлі ў БХД. Канечне, задаволены, што там апынуўся. Мы лічым, што хрысціянін не павінен адмяжоўвацца ад палітыкі. Наадварот, ён адказны за лёс краіны. БХД адпавядае нашым поглядам. Мы павінны прынесці ў палітыку хрысціянскія каштоўнасці, хрысціянскіх палітыкаў, хрысціянскіх прэзідэнтаў.

**«НН»: А чаму вырашылі абліць Леніна фарбай?**


BCHD.INFO

**ЮК:** Мяне абурае, што людзі працягваюць адзначаць дзень 7 лістапада. Ушаноўваюць забойцу, ставяць яму помнікі, прыносяць кветкі. Пры Леніну ў Савецкім Саюзе з'явіліся канцэнтрацыйныя лагеры. Трэба процістаяць гэтаму злу. Я не збіраўся пашкодзіць помнік, інакш бы прыйшоў з чым больш цяжкім, а хацеў прыцягнуць увагу да гэтай праблемы.

**«НН»: І ўдалося?**

**ЮК:** Цяжка сказаць. Але людзі даведаліся ў Навагрудку, што Леніна аблілі фарбай. Нехта пра гэта задумаецца. Чатыры дні мы збіралі подпісы за дэмантаж помніка. Атрымалася сабраць 70 подпісаў. Гэта не так і мала. У асноўным, падпісвалася моладзь. У нас хапае сваіх герояў, якіх трэба ўшаноўваць. На судзе адзін гісторык сказала, што трэба быць талерантнымі да іншых поглядаў. Але чаму тады ніхто не ўсталёўвае помнікі Гітлеру? Бо кожны ведае, што ён забойца.

**«НН»: Перад судом хваляваліся?**

**ЮК:** Трохі. Больш хвалявалася жонка, яна цяпер цяжарная. Я ведаю, што рабіў правільную справу, таму быў спакойны.

**Гутарыў ЗП**

# Наклеена ў Беларусі

**Этыкетка «Інтэграла» імгненна пераўтварае імпартныя маніторы ў айчынныя.**

Імпартазамяшчальны скандал разгарэўся пасля таго, як супрацоўнікі адной з мінскіх фірм выявілі, што на купленых маніторах «Інтэграл» быў абаронны экран іншай кампаніі, тайваньскай Acer.

Калі ж з корпуса манітора адклеілі ўсе надпісы «INTEGRAL», сумневаў не засталося. Пад кожным фірмовым знакам мінскага завода стаяў надпіс «ACER»...

Супрацоўнікі «Інтэграла» не бачаць у сваіх дзеяннях нічога злачыннага. У інтэрв'ю парталу tut.by прадстаўнік завода растлумачыў: «Інтэграл» не выпускае складнікаў для маніторaў, таму купляе іх там, дзе больш выгадна па цане і якасці. Такім самым чынам праца вядзецца з Philips і іншымі вытворцамі.

### Наклейка за $55

Паколькі дзяржаўныя арганізацыі абавязаныя купляць тэхніку выключна беларускай вытворчасці, прадукцыя «Інтэграла» разыходзіцца на ўра. Праблема ў цане. «Псеўдаінтэгральны» манітор каштуе больш за 600 тысяч рублёў. А такі самы арыгінальны манітор Acer V193HQDb, без налепак «Інтэграла», можна набыць у беларускіх інтэрнэт-крамах за 450 тысяч рублёў.

Такім чынам, мінскі завод ацэньвае наклейванне пары сваіх этыкетак і ўпакоўку ў фірмовую каробку ў 150 тысяч рублёў.

### «Інтэграл» супраць «Самсунга»

Увогуле ж, на патрабавальны густ беларусаў выстаўлены пяць мадэляў маніторaў «Інтэграл». Параўнанне іх цэн з цэнамі на падобныя па характарыстыках маніторы іншых вытворцаў выглядае не на карысць мінскай прадукцыі.

**ЯМ**



**Маніторы з экранам 19 дзюймаў**
INTEGRAL 19» TFT LCD ($269)
Samsung SyncMaster 940N ($168)
**Шырокафарматныя маніторы з экранам 19 дзюймаў**
INTEGRAL 19» TFT LCD WIDE ($219)
Samsung SyncMaster 923NW ($143)
**Шырокафарматныя маніторы з экранам 22 дзюймы**
INTEGRAL 22» TFT LCD ($269)
Samsung SyncMaster 2223NW — ($179)

# Расія дала грошы на пенсіі і заробкі

**Павелічэнне пенсій і заробкаў бюджэтнікам пачало перадвыбарную кампанію залагоджвання насельніцтва.**

З 1 студзеня тарыфная стаўка першага разраду павялічылася з 77 тысяч да 81 тысячы рублёў. Гэта значыць, што з лютага заробкі бюджэтнікаў павялічацца на 5%. Апошні раз стаўка змянялася ў канцы 2008 года, калі пад ціскам Міжнароднага валютнага фонду заробкі былі зменшаныя.

Летась улады стрымлівалі абяцанні, дадзеныя сусветным фінансістам, і не падымалі памер стаўкі, каб атрымаць апошнія часткі крэдыту. Але перавыбарны год — не час для выканання парадаў ад МВФ. Тым больш што Расія можа даць грошы, не патрабуючы эканамічных рэформаў.

Змены закранулі і пенсіі. Яны ўзраслі на 9%. Цяпер сярэдняя пенсія складае 468 тысяч рублёў. Апошні раз памер пенсій змяняўся два месяцы таму. Тады ў парушэнне закону выплаты пенсіянерам не былі павялічаны да належнага ўзроўню, кожны пенсіянер недаатрымліваў па 43 тысячы рублёў штомесяц. Цяпер «недаплата» зменшыцца. Дзяржава будзе недадаваць кожнаму пенсіянеру па 5 тысяч рублёў.

Пабагацеюць і маладыя сем'і з дзецьмі ва ўзросце не больш за 3 гады. Дапамога ім цяпер будзе складаць 250 тысяч рублёў замест 200 тысяч, якія выплачваліся раней.

Адкуль грошы? 30 снежня чатыры расійскія банкі — «Знешэканомбанк», «Сбербанк», «Газпромбанк» і «Альфа-банк» — выдалі Беларусі калядны крэдыт памерам 6 млрд расійскіх рублёў (каля $200 млн). За дзень да таго грошы прапанаваў Кітай. У азіяцкага гіганта Беларусь можа пазычыць $5,7 мільярда. Калі захоча. Бо ўмовы кітайскіх крэдытаў зусім нявыгадныя.

**Ягор Марціновіч**

# Эканамічныя цуды

У Мінску адбылася першая міжнародная канферэнцыя Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра (BEROC). Арганізатары ставілі за мэту сабраць найлепшых эканамістаў свету беларускага паходжання.

Прафесары Ельскага ўніверсітэта (ЗША) Міхаіл Голасаў і Алег Цывінскі, прафесар Універсітэта Арызоны (ЗША) і Ганконгскага ўніверсітэта навукі і тэхналогій Юрый Церлюкевіч вярнуліся на некалькі дзён у Беларусь, каб прачытаць адкрытыя лекцыі тутэйшым эканамістам.

На сустрэчу з навукоўцамі прыйшлі некалькі дзесяткаў слухачоў. Пасля ўступнага слова рэктара Маскоўскай бізнэс-школы Паўла Данэйкі, прамоўленага па-беларуску, канферэнцыя цалкам перайшла на англійскую мову. Арганізатары падкрэсліваюць, што беларускія эканамісты змогуць выходзіць на сусветны ўзровень толькі дасканала ведаючы гэту мову міжнародных зносінаў.

Даследчы цэнтр ставіць за мэту аб'яднаць беларусаў-эканамістаў з усяго свету. Мінская сустрэча — першая акадэмічная канферэнцыя, якая праводзілася па стандартах вядучых замежных універсітэтаў.

Усе праекты цэнтра фінансуюцца дзяржаўным шведскім фондам SIDO і іншымі скандынаўскімі донарамі.

### Палескае акно ў Еўропу

Асноўная ініцыятыва Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра — стварэнне курсаў эканомікі, своеасаблівы протаўніверсітэт, дзе выкладанне будзе праходзіць на сур'ёзным сусветным узроўні. Адкрыццё праграмы запланавана на 2011 ці 2012 год. Хоць, падкрэсліваюць арганізатары, усё будзе залежыць ад фінансавання і юрыдычнага статусу.

Нацбанк, напрыклад, прапануе для праграмы пляцоўку Палескага ўніверсітэта ў Пінску. Патрэбныя і беларускія прафесары, якія змогуць там працаваць. Для чытання кароткатэрміновых курсаў будуць запрашацца навукоўцы з-за мяжы, але асноўная нагрузка ўсё роўна ляжа на айчынных спецыялістаў. Чакаецца, што засвойваць англійскамоўную магістарскую эканамічную праграму змогуць 20—30 студэнтаў.

**ЯМ**

# Беларус з Федэральнай рэзервовай службы ЗША

Прафесар эканомікі Ельскага ўніверсітэта Міхаіл Голасаў адказаў на пытанні «Нашай Нівы»:

**«НН»: Раскажыце, калі ласка, трохі пра сябе.**

**Міхаіл Голасаў:** Я нарадзіўся ў Віцебску. Вучыўся ў Мінску ў Эканамічным універсітэце. Потым аспірантуру і дактарантуру праходзіў у ЗША. Спачатку было цяжка, бо не было добрай першапачатковай базы. Даводзілася з нуля фактычна вучыць эканоміку, матэматыку.

**«НН»: Наша адукацыя такая слабая?**

**МГ:** Не, я б не сказаў. Рэч у тым, што БДЭУ больш сабой нагадвае бізнэс-школу.



Ён рыхтуе спецыялістаў у вельмі вузкай сферы. Скажам, у банкаўскай справе. І выпускнік наргаса гатовы адразу пасля выпуску ісці працаваць у банк. А займацца эканомікай на навуковым узроўні — да гэтага я быў не гатовы. Застаўся ў ЗША, бо хацеў на сур'ёзным узроўні займацца эканомікай. Нават еўрапейскія ўніверсітэты значна адстаюць ад амерыканскіх у навуковым плане. Выкладаць я пачынаў у Масачусетсе, Гарвардзе. Цяпер вось у Ельскім універсітэце.

**«НН»: А беларусаў-выкладчыкаў у гэтых ВНУ сустракалі?**

**МГ:** Мала. Сёння ў нас у базе ёсць 29 беларускіх выкладчыкаў з заходніх універсітэтаў, якія займаюцца эканомікай. Праўда, няма звестак па Брытаніі. Але агулам гэтая лічба складае, думаю, каля 40 чалавек. Некаторых ведаю, з некаторымі стасаваліся толькі па электроннай пошце, з трэцімі — сустрэліся ўпершыню ў Мінску. Адносна таго, што мы прадстаўлялі сабе раней, гэта шмат. Аднак тых жа чэхаў нашмат болей. Я гавару толькі пра эканоміку. Пэўна, у матэматыцы, дакладных навуках беларускіх выкладчыкаў больш.

**«НН»: Вас не запрашалі яшчэ папрацаваць у беларускім урадзе? Ці было б цікава Вам гэта?**

**МГ:** Не, не запрашалі. У прынцыпе, было б цікава. Апроч выкладання, я таксама працаваў у Федэральнай рэзервовай сістэме ЗША, маю досвед.

**Зміцер Панкавец**

## Сцісла



### Мабільнік з Мастоў

«Мастоўская сельгастэхніка» прэзентавала сотавы тэлефон для пажылых людзей, які плануецца выпускаць на прадпрыемстве. Такі мабільнік у некалькіх мадыфікацыях ужо выпускаецца ў Кітаі. Каштуе ж ён $15-20.

### Не аддаваць грошы!

Каля чвэрці жыхароў Ісландыі выступілі супраць вяртання сродкаў іншаземцам, якія мелі ўклады ў ісландскім банку-банкруце Icesave. Петыцыю падпісалі больш за 56 тысяч чалавек. Яны заклікалі кіраўніка дзяржавы правесці рэферэндум па гэтым пытанні. Брытанцам і галандцам, якія пацярпелі ў выніку банкруцтва банка ў 2008 г., павінна быць выплачана больш за $5 млрд.

Ісландскім банкам верылі, бо ўсё скандынаўскае славіцца сваёй надзейнасцю. Аднак менавіта перарызыкаваныя ісландскія банкі першымі не вытрымалі крызісу.

### Прыватная станцыя метро

Маскоўскі бізнэсмен Арас Агалараў уклаў $20 млн, каб правесці метрапалітэн да свайго гандлёвага комплекса. Станцыя «Мякініна» будуецца за межамі Масквы, на тэрыторыі Маскоўскай вобласці. Пасля адкрыцця будзе перададзеная ва ўласнасць муніцыпалітэту.

**ЯМ**

# «Народную волю» папярэдзілі на Каляды

**Незалежная газета атрымала своеасаблівы калядны падарунак ад Міністэрства інфармацыі — выданне пакаралі за распаўсюд нібыта не адпаведнай рэчаіснасці інфармацыі. Гэта было другое папярэджанне за год.**

24 снежня 2009 г. Мініінфармацыі папярэдзіла недзяржаўную газету «Народная воля» за парушэнне арт. 4 закона «Аб СМІ» — распаўсюд не адпаведнай рэчаіснасці інфармацыі. У №193-194 ад 11-14 снежня «НВ» надрукавала пералік гандлёвых кропак «Белсаюздруку» ў Мінску, дзе можна аформіць падпіску на газету танней, чым на пошце. Газета назвала гэтыя ўмовы «льготным тарыфам». «Паводле інфармацыі, атрыманай ад РУП «Белсаюздрук» (...), дадзеныя звесткі не адпавядаюць рэчаіснасці, паколькі згаданая арганізацыя аказвае паслугі па прыёме падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі на падставе зацверджанага Міністэрствам інфармацыі тарыфу. Пры гэтым якога-небудзь ільгатавання па газеце «Народная воля» не прадугледжана», — гаворыцца ў дакуменце за подпісам прызначанага 4 снежня 2009 г. на пасаду міністра інфармацыі Алега Праляскоўскага.

«Чаго заўгодна можна было чакаць ад уладаў, толькі не такога. У самыя драконаўскія часы газеты каралі за палітычныя памылкі, але каб за сэнсавую недакладнасць выносіць папярэджанне, не ведаю», — каментуе папярэджанне рэдактар «Народнай волі» Іосіф Сярэдзіч. Ён лічыць памылку рэдакцыі неадпаведнай пакаранню. «Зямля ад гэтага зварухнулася, улада змянілася, людзі на вуліцы павыходзілі абураныя ды заплаканыя? — кіпіць рэдактар. — Вы можаце сабе ўявіць узровень працы чыноўнікаў. Ці не гаворыць гэта пра прафесійны ўзровень таго ж Праляскоўскага? Няхай ён адкажа на гэтае пытанне».

Гэта ўжо другое цягам года папярэджанне на адрас газеты. 17 лістапада рэдакцыю «НВ» пісьмова папярэдзілі за артыкул «...Не мешай другим отстаивать свободу». Выданне аспрэчыла папярэджанне (працэдура каштуе 700 000 рублёў), але міністр пакінуў яго ў сіле. Згодна закона, вынясенне рэдакцыі альбо заснавальніку СМІ на працягу года двух і больш папярэджанняў можа пацягнуць за сабой прыпыненне выпуску гэтага СМІ.

**У лістападзе 2009 г. былі таксама папярэджаныя газеты «Наша Ніва», «КП в Беларуси» і «Ва-Банк». Першыя дзве былі пакараныя за публікацыю непацверджанай інфармацыі пра грып.**

Папярэджанне, выпісанае «Народнай волі» Праляскоўскім, не першы выпадак у гісторыі дачыненняў чыноўніка і незалежнага выдання. У кастрычніку 2007 года тады яшчэ начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта А. Праляскоўскі адсудзіў у газеты 27 млн рублёў за публікацыю артыкула «Уладзімір Холад па-ранейшаму знаходзіцца ў СІЗА».

**Сямён Печанко**

**Алег Праляскоўскі**

гадаванец Службы бяспекі прэзідэнта. Стуль прызначаны генеральным дырэктарам агенцтва БЕЛТА. У 2003 годзе стаў намеснікам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Пасля — памочнікам прэзідэнта па ідэалогіі. Кіраваў ідэалагічнай вертыкаллю, пакуль ягонага намесніка, Холада, не пасадзілі за атрыманне буйнога хабару. Холад быў свайго роду «сувязным» між Адміністрацыяй і Цэнтравыбаркамам Ярмошынай, засядаў у ЦВК. У няласцы Праляскоўскага перасадзілі ў дырэктары Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта. 4 снежня 2009 яго прызначылі міністрам інфармацыі Беларусі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алег Праляскоўскі на з'ездзе «Белай Русі».**

# Ідэалогія Праляскоўскага — ідэалогія Лукашэнкі

Алег Праляскоўскі, міністр інфармацыі Беларусі, і Леў Крыштаповіч, намеснік дырэктара Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта, апублікавалі ў №12 часопіса «Нёман» за 2009 год артыкул «Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі ў сучасным свеце». Прапануем Вашай увазе *выбраныя цытаты адтуль.*

«...Саюзная дзяржава аб'ектыўна ўзмацняе аб'яднаўчыя працэсы на постсавецкай прасторы. У Заяве З'езда славянскіх народаў Беларусі, Расіі, Украіны гаворыцца: «Час зноў ставіць у лік неадкладных пытанняў аб'яднанне славянскіх народаў і, у першую чаргу, украінцаў, беларусаў і расійцаў, якія апынуліся пад адкрытым ціскам заходняй цывілізацыі...

...Калі казаць пра спецыфіку эканамічных сістэм Расіі і Беларусі, то яна якраз на карысць Беларусі...

...Пытанне будаўніцтва беларуска-расійскай саюзнай дзяржавы з'яўляецца галоўным пытаннем постсавецкай рэчаіснасці. Адсюль і тая вядомая незадаволенасць сярод нашых грамадзян, выкліканая павольным вырашэннем, здавалася б, цалкам яснай праблемы. Вядома, няўвычная нібыта працяглая і заблытанасць працэсу аб'яднання нашых брацкіх народаў залежыць не толькі ад размаху аб'ектыўных разбурэнняў, але і ад свядомага супрацьдзеяння антысаюзных палітычных сілаў у Расіі і Беларусі. Гэтыя сілы, якія крыюцца пад маскай дэмакратыі і абапіраюцца на магутную фінансавую, дыпламатычную і ідэалагічную падтрымку Захаду і антынацыянальных алігархаў у Расіі, робяць усё, каб, калі не спыніць беларуска-расійскае аб'яднанне, то, па меншай меры, затармазіць яго, расцягнуць у часе да бясконцасці...

...Рэаліі сёння такія, што барацьба вакол інтэграцыі Беларусі і Расіі выліваецца ў інфармацыйную вайну з усімі ўласцівымі ёй метадамі і сродкамі вядзення...

...Асабліва шырока для псіхалагічнай апрацоўкі выкарыстоўваецца бескантрольны інтэрнэт. Інфармацыя, размешчаная на сайтах, у шэрагу выпадкаў стварае патэнцыйную або рэальную пагрозу нацыянальнай бяспецы дзяржавы, унушае абсалютна згубныя для грамадства стэрэатыпы:

1. Расія не здольная самастойна развівацца і ствараць высокія тэхналогіі.

2. Расія — гэта «імперыя зла», якая гістарычна асуджана.

3. Расія павінна адмовіцца ад стварэння саюза славянскіх народаў як бесперспектыўнага шляху развіцця.

...Праблема будаўніцтва саюзнай дзяржавы паглыбляецца супрацьдзеяннем агентуры ўплыву заходніх дзяржаваў, перш за ўсё на тэрыторыі Расіі... Менавіта палітычная эліта сёння з'яўляецца галоўным аб'ектам увагі; кіраванне ёю, як паказвае досвед, забяспечвае пранікненне антысаюзнай псіхалогіі ў структуры вышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва Расіі, што падобна паражэнню ў вайне і акупацыі. Паказальна, што аб'ект таемнага ўплыву не павінен падазраваць пра метады ўплыву і мэты кіравання ім...

...Разам з тым, трэба прызнаць, што сярод суб'ектаў гаспадарання ёсць нямала структураў і арганізацый, карпаратыўным інтарэсам якіх саюзнае будаўніцтва толькі перашкаджае. Па-першае, гэта вялікія карпарацыі расійскага ТЭК — «Газпром», «Роснефть», іншыя кампаніі, якія ў значнай меры вызначаюць замежнаэканамічную палітыку Расіі...

...Як падкрэсліваў прэзідэнт А.Р.Лукашэнка у Пасланні беларускаму народу і нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь 23 красавіка 2009 г., «беларускі народ і рускі — адзін народ», а таму супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй і саюзнае будаўніцтва з ёй мае для Беларусі стратэгічнае значэнне...»

**НБ**

# Як будзе выглядаць гатэль «Кемпінскі» ў Мінску

**У 2013 годзе ля цырка з'явіцца дзевяціпавярховы гатэльны комплекс.**

Пры канцы лістапада 2009 года ў часе абмеркавання перспектывы ў развіцця сталіцы Лукашэнка ўхваліў падкарэктаваны генеральны план Мінска да 2030 года. У тым ліку найвышэйшае адабрэнне атрымалі планы пабудовы новага шматфункцыянальнага комплексу з гатэлем «Кемпінскі». Комплекс мае паўстаць ў 2013 г. між праспектам Незалежнасці, вуліцай Янкі Купалы і Свіслаччу непадалёкад Белдзяржцырка. Праектаваннем зоймецца маскоўская архітэктурная майстэрня «SPeeCH», якая ўжо праектавала гатэлі «Kempinski» ў Ніжнім Ноўгарадзе і Кіеве.

У ахвяру гатэльнаму комплексу прынеслі будынкі першай мінскай электрастанцыі — помніка прамысловай архітэктуры XIX ст. Ён ёсць і ў Спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей, аднак у прысвечаным «Kempinski» артыкуле на сайце Агенцтва архітэктурных навінаў гаворыцца, што «на ўчастку зараз некалькі прамысловых аб'ектаў, якія падлягаюць зносу».

Комплекс будзе складацца з чатырох будынкаў: гатэль, два корпусы апартаментаў і офісны блок. Гатэльная частка будзе звернутая да Свіслачы, офісная — да праспекта. Плошча комплексу сягае 50 000 кв.м., з іх падземная частка з паркінгам — каля 18 тысяч кв.м. Інфармацыя пра колькасць паверхаў у розных крыніцах розная. Так, на сайце кампаніі-праекціроўшчыка гаворыцца пра 10 паверхаў, а Агенцтва архітэктурных навінаў паведамляе пра 9.

Гатэльны аператар «Кемпінскі» не ўпершыню прыглядаецца да будаўнічых пляцовак Мінска. Папярэдні праект прадугледжваў пабудову хмарачоса на Кастрычніцкай за грошы сірыйскага інвестара. Праз фінансавы крызіс ён адкладзены на нявызначаны час. А сам той праект спецыялісты расцанілі як пагрозу цэласнасці ансамбля Кастрычніцкай плошчы і сілуэта Верхняга горада.

**СП**



# Быў першым у краіне — стаў 10-м у «Леху»

Найлепшы футбаліст чэмпіянату Беларусі па футболе Сяргей Крывец нечакана заключыў кантракт з польскім футбольным клубам «Лех». Кантракт на суму ў 300 тысяч еўра падпісаны на тры з паловай гады. Гуляць футбаліст будзе пад нумарам 10. З Сяргеем Крыўцом гутарыць карэспандэнт «НН».




**Сяргей Крывец**

нар. 8 чэрвеня 1986 у Гродне. Чатырохразовы чэмпіён Беларусі (2006—2009). Гуляў за мінскі «Лакаматыў», барысаўскі БАТЭ. За нацыянальную зборную згуляў 4 гульні. Аўтар першага гола беларускага клуба ў групавым этапе Лігі чэмпіёнаў (30 верасня 2008 у вароты «Ювентуса»). У 2009 прызнаны найлепшым гульцом чэмпіянату Беларусі.

**«Лех»**

познанскі футбольны клуб. Заснаваны ў 1922. Пяціразовы чэмпіён Польшчы (1983, 1984, 1990, 1992, 1993), чатыры разы браў бронзавыя медалі чэмпіянату, прычым апошні раз у 2009 г. Чатырохразовы уладальнік Кубка краіны, апошні раз — у 2009 г. «Лех» мае найбольшую фанацкую падтрымку ў Польшчы, у сярэднім на матчы збіраецца па 16 тысяч чалавек.

**«Наша Ніва»: Пераходам у познанскі «Лех» задаволены?**

**Сяргей Крывец:** Канечне. Інакш бы кантракт не падпісваў. З боку «Леха» мяне падкупіла іхняя канкрэтыка і зацікаўленасць.

**«НН»: А іншыя варыянты працягу кар'еры былі?**

**СК:** Былі. З Італіі, з Партугаліі. Але які ўжо сэнс пра іх гаварыць, калі я стаў гульцом «Леха»? Ці стану я лідэрам польскага клуба — будзе залежыць толькі ад мяне, але бачна, што ў камандзе на мяне разлічваюць.

**«НН»: А чэмпіянат Польшчы мацней за беларускі?**

**СК:** Складана адказаць. Аднак думаю, што троху мацнейшы. Як пачнецца сезон, то патэлефануйце яшчэ раз. Больш дакладна адкажу на пытанне.

**«НН»: Умінулым сезоне Вы пачалі весці блог на беларускай мове. З якой мэтай гэта рабілася?**

**СК:** Былі пажаданні з боку балельшчыкаў. Я падумаў: а чаму б і не? Гэта выклікала вельмі вялікую колькасць водгукаў. Большасць абсалютна станоўчыя. Калі гэты блог некалі будзе адноўлены, то магчыма працягну весці яго па-беларуску.

**«НН»: А што можаце ўвогуле сказаць пра мінулы сезон? Задаволеныя ім?**

**СК:** У прынцыпе, задаволены, хаця не на 100 працэнтаў. Шмат станоўчых эмоцый прынеслі чэмпіёнства ў Беларусі, удзел у Лізе Еўропы, асабістыя дасягненні таксама парадавалі.

**«НН»: Чакалі, што станеце найлепшым гульцом унутранага першынства і трэцім футбалістам краіны?**

**СК:** Вельмі прыемна, што мяне так адзначылі. Тое, што стану найлепшым ва ўнутраным першынстве, шчыра кажучы, было досыць чакана. Я да гэтага доўга і мэтаскіравана ішоў. А вось прызнанне трэцім футбалістам краіны было сюрпрызам. Асабіста я паставіў бы на два першыя месцы Аляксандра Кульчыя і Юрыя Жаўнова, а вось з трэцім трэба падумаць.

**«НН»: А чаму пры ўсіх асабістых дасягненнях замацавацца ў складзе зборнай не змаглі?**

**СК:** Цяжкае пытанне. Напэўна, не хапіла шанцавання і майстэрства. Мяне хоць і выпускалі на поле ненадоўга, але шанцы былі, а я імі не змог скарыстацца. У камандзе Бернда Штанге я яшчэ адносна нядаўна. Ёсць з чым працаваць, каб у будучыні стабільна гуляць.

**«НН»: Узровень Лігі Еўропы-2009 моцна адрозніваецца ад Лігі чэмпіёнаў-2008?**

**СК:** Адрозніваецца, але не вельмі. Канечне, імёны такіх клубаў, як «Ювентус» ці «Рэал» выклікаюць у балельшчыкаў куды большыя эмоцыі, але нельга сказаць, што «Бенфіка» з «Эвертанам» былі слабымі супернікамі. Адзінае, што непрыемна ўразіла, дык гэта паўпустыя трыбуны стадыёна «Дынама» падчас нашых хатніх матчаў у Лізе Еўропы.

**«НН»: А які матч сезона запомніўся найбольш?**

**СК:** Найперш усплывае ў памяці гульня ў Балгарыі з «Літэксам», калі мы вырвалі перамогу на апошніх хвілінах. Запомнілася сустрэча дома з грэчаскім АЕКам — гэта была фактычна наша першая сапраўдная перамога ў еўракубках. Вельмі важным у псіхалагічным плане быў матч у пачатку сезона з мінскім «Дынама», калі мы іх разграмілі з лікам 4:0.

**«НН»: БАТЭ з Вашым сыходам аслабне?**

**СК:** Я так не думаю. Каманда не павінна моцна залежыць ад аднаго канкрэтнага гульца, і ягоны сыход павінен прайсці асабліва незаўважна. Спадзяюся, што з БАТЭ так і будзе.

**«НН»: З Капскім і Ганчарэнкам развіталіся?**

**СК:** Так, і наш генеральны дырэктар, і трэнер пазычылі мне поспехаў на новым месцы. Развіталіся з імі вельмі прыязна.

**«НН»: А якія планы на гэты год?**

**СК:** Стаць чэмпіёнам Польшчы, стаць гульцом асноўнага складу «Леха». Як мінімум, хочацца не зніжаць тую планку, якую мне атрымалася падняць у складзе БАТЭ.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

## СЦІСЛА

### Невясёлыя вынікі 1 студзеня

За навагоднія суткі ў Мінску ад петардаў пацярпелі дзевяць чалавек, з іх трое шпіталізаваныя і ўсе — з пашкоджаннямі вачэй. На мінскую станцыю хуткай медыцынскай дапамогі паступіла 48 зваротаў з прычыны галалёдных траўмаў, два чалавекі шпіталізаваныя. Зафіксавана 16 алкагольных атручванняў (8 чалавек шпіталізаваныя). 1 студзеня ў Мінскай вобласці затрымалі 30 п'яных кіроўцаў. Адзін чалавек загінуў у ДТЗ: ва Уздзенскім раёне у 7.30 1 студзеня на 55-м кіламетры дарогі Мінск — Слуцк — Мікашэвічы кіроўца 1965 г.н. на «Лексусе» не даў рады кіраванню, з'ехаў у кювет, дзе машына перакулілася і ўрэзалася ў дрэва. Мужчына ад атрыманых траўмаў памёр на месцы.

### Прычыны пажараў — трэшчыны ў коміне

Два дамы гарэлі ў Вілейскім раёне 28 і 29 снежня. Прычына ўзгарання — трэшчыны ў коміне. Людзі не пацярпелі. Згарэў дачны дом у вёсцы Лоцевічы Касцяневіцкага сельсавета. Напярэдадні там працавалі рабочыя. Яны шліфавалі сцены і апрацоўвалі іх лёгкай на загаранне вадкасцю. Пасля работы прапалілі печ і пайшлі начаваць у суседні дом. Пажар заўважылі суседзі, яны і выклікалі выратавальнікаў.

На наступны дзень, 29 снежня, здарыўся пажар у вёсцы Мацькаўцы Альковіцкага сельсавета. 65-гадовая пенсіянерка прапаліла печ, а іскры праз шчыліны ў коміне патрапілі на гарышча.

### Замерзла ў полі

У полі між вёскамі Абадоўцы і Дварэц (Вілейскі раён) знойдзена цела 50-гадовай жанчыны. Папярэдняя прычына смерці — пераахаладжэнне. На памерлай была толькі вопратка, адзенне ляжала побач. Можна меркаваць, што перад смерцю жанчына чагосьці распраналася.

Гэта тыповы выпадак. Калі чалавек пачынае замярзаць, яму становіцца горача, ён распранаецца, кладзецца, засынае і больш не прачынаецца, наступае смерць ад пераахаладжэння.

Жанчына ў нядзелю, 20 снежня, выйшла з Абадоўцаў, дзе жыла з мужам і 30-гадовым сынам, да сваякоў у Дварэц. Пайшла не па дарозе, а праз поле. Да Дварца не дайшла. Шукаць пачалі, калі з Дварца пазванілі сваякі і сказалі, што госця да іх не дайшла. У полі сваю памерлую маці знайшоў сын.

### Абрабаваны філіял «Беларусбанка» ў Брэсце

Па падазрэнні ва ўчыненні рабаўнічага нападу на філіял «Беларусбанка» ў Брэсце затрыманы 42-гадовы рабочы Беларускай чыгункі. Злачынства было ўчынена 29 снежня. У аддзяленне банка зайшоў невядомы ў масцы, скраў, пагражаючы прадметам, падобным да пісталета, 2300 расійскіх рублёў і знік. Затрымаць падазраванага ўдалося з дапамогай службовага сабакі.

### Жыхар Светлагорска скраў з клуба ялінку

А 3-й ночы 27 снежня з залы гульнявых аўтаматаў аднаго са светлагорскіх клубаў была скрадзеная навагодняя ялінка. Злачынства ўчыніў непрацуючы, раней не судзімы 24-гадовы жыхар Светлагорска.

### Крымінальны саюз зяця і цешчы

24-гадовы будаўнік быў затрыманы пры спробе скрасці з аб'екта, дзе сам працаваў, радыятарныя батарэі. Да гэтага некалькі такіх спроб завяршыліся паспяхова. Раней скрадзеныя батарэі ён хаваў у падвале цешчы.

### Напад на кіроўцу «хуткай»

28 снежня ўначы брыгада медыкаў прыехала па выкліку на мінскую вуліцу Ясеніна. Калі дактары зайшлі ў пад'езд, а кіроўца пачаў разварочвацца, да яго на хаду заскочыў малады мужчына. Пагражаючы нажом, зламыснік забраў у кіроўцы мабільны тэлефон і газавы балончык і ўцёк. Зламысніка праз некаторы час затрымалі па прыкметах. У дачыненні да 25-гадовага раней не судзімага мінчаніна распачата крымінальная справа за рабаўніцтва.

### У ДТЗ у Смаргонскім раёне загінулі двое дзяцей

Тры чалавекі, у тым ліку двое дзяцей, загінулі ў выніку дарожна-транспартнага здарэння ў Смаргонскім раёне. Паблізу мястэчка Крэва 26-гадовы кіроўца «Аўдзі» выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з грузавіком «Сканія». Кіроўца легкавіка і бацька, які ехаў з ім, трапілі ў бальніцу, а 28-гадовая сужыцелька, ейны васьмігадовы сын і пяцігадовая дачка загінулі.

### У Віцебску школьнікі скралі вібратары на 9 мільёнаў

Віцебскі дзесяцікласнік з навучэнцам вячэрняй школы і непрацуючым абрабавалі завод крупнапанэльнага домабудавання. Хлопцы скралі два прамысловыя вібратары агульным коштам 9 млн рублёў. Распачатая крымінальная справа.

**СМ; «Рэгіянальная газета», БелаПАН, «Еўрарадыё»**



ZYALT.LIVEJOURNAL.COM

# Вяртанне на Радзіму

**Колькі сем'яў развалілася з прычыны паездак мужчынаў на заробкі — не злічыць.**

Адзін мой знаёмы, назавем яго Аляксей, дзевяць гадоў назад паехаў на заробкі ў Маскву. Падбіла яго на гэту справу жонка. Жанчына ніколі не ўмела размяркаваць малыя даходы, таму марыла пра вялікія грошы.

Аляксей па знаёмстве ўладкаваўся на работу да беларуса, які ў Маскве меў сваю фірму па вырабе пластыкавых вокнаў. Пачатак быў неблагі. Засмучала толькі праблема з жыллём. Грошай бракавала, зняў пакой у двухпакаёвай кватэры. У суседнім пакоі жылі гаспадары. Сям'я з чатырох чалавек: муж, жонка і двое дзяцей-падлеткаў. Жыццё на кватэры было напружаным. Кожны вечар, вяртаючыся з работы, да глыбокай ночы ён выслухоўваў, што гаспадар думае пра сваю жонку і іх дзяцей і ўсіх іх сваякоў. Жонка не маўчала. Дэбаты часта праходзілі за бутэлькай. Аляксея таксама запрашалі, але ён сціпла адмаўляўся і розум меў, бо гаспадар распускаў рукі, біў жонку і дзяцей, магло перапасці і Аляксею.

Жанчына імкнулася быць добрай гаспадыняй, таму перыядычна запіхвала ў пральную машыну каляровую і белую бялізну разам, а праз гадзіну даставала агульную шэрую масу. Развешвала яе на вяроўках у пярэдняй і кухні. Туалет непрыемна пахнуў. У ванным пакоі былі пашарпаныя сцены. На кухні што-небудзь прыгатаваць было немагчыма, там увесь час праводзілі за цяжкой размовай гаспадары.

У гэты час у Мінску жонка жыла бесклапотна. Вызваліўшыся ад абавязкаў перад мужам, яна мела шмат вольнага часу, на работу ўладкоўвацца не спяшалася і толькі чакала чарговага грашовага пераказу з Масквы. Па ўсім было відаць, што жанчына павінна разбагацець.

Прайшло паўгода. І тут трывогу ўзняла свякроўка. Пачала ўшчуваць нявестку, што тая адправіла мужа ў Маскву аднаго. Ён можа звязацца з якой кабетай і кінуць сям'ю. А ў іх жа дачка, яе трэба выхоўваць. Жонка занепакоілася. Вырашыла паехаць да мужа, але што рабіць з маленькай дачкой? Бабулі наадрэз адмовіліся браць да сябе дзіця пры жывых і здаровых бацьках. Прыйшлося забіраць дачку ў Маскву, а там плаціць хабар, каб яе прынялі ў школу, рабіць рэгістрацыю. Яшчэ праблемы з праграмай навучання, псіхалагічныя праблемы і г.д. Прасцей было вярнуць дамоў тату, але ж Масква, вялікія грошы...

Аляксей зняў аднапакаёўку ў прыгарадзе. Ён быў рады, што пазбавіўся ад п'яных суседзяў і будзе жыць з сям'ёй. Прайшоў год, а грошы так і не з'явіліся. Усе гэтыя пераезды, грашовыя пераказы, білеты на цягнікі, хабары, рэгістрацыі... Сям'я жыла ад зарплаты да зарплаты, а працаваў Аляксей удвая болей, чым у Мінску. Дамоў прыходзіў толькі пераначаваць. Сямейнае жыццё ў Маскве было такое ж, як і ў Мінску. Зноў нечага хацелася, і ўсё не выходзіла.

Так прайшоў другі год, трэці... Калі ўдавалася сабраць капейку, жонка ляцела на курорт.

Праз пяць гадоў стаміліся абое. Фірму па вытворчасці вокнаў гаспадар прадаў. Аляксея скарацілі, прыйшлося шукаць іншыя, часам разавыя заробкі. Грошай ледзь хапала на мінімальныя патрэбы. У сям'і пачасціліся скандалы. Ірына пачала на доўгі час з'язджаць у Мінск, кідаючы дачку на мужа. Матывавала тым, што ў Мінску распачне бізнэс з кірункам на Маскву. На справе ж збягала ад праблем. Аляксей пачаў круціць раманы з такімі ж прыезджымі жанчынамі. Так і жылі: хто каго болей абдурыць.

Дачка падрасла, стала выкідаць фортэлі, сыходзіць з дому, даводзіць свае правы. У адзін з такіх звычайных дзён, зноў пасварыўшыся з жонкай і правёўшы яе ў чарговую паездку, Аляксей вярнуўся дадому. Работы не было, у кашальку ляжалі апошнія грошы. Ён зайшоў у пад'езд, і тут каля дзвярэй кватэры на яго напалі двое мужчын. Хацелі адабраць барсетку.

Невядома, што на яго найшло: з усяго маху ўдарыў аднаго па галаве бутэлькай піва. Другога, зніякавелага, — кулаком у твар. Ды так моцна, што на пляцоўцы засталіся ляжаць два непрытомныя целы. Пасля збегаў у кватэру, прынёс вяроўкі для бялізны, звязаў абодвум рукі і прывязаў да батарэі. Выклікаў міліцыю. Калі рабаўнікі апрытомнелі, высветлілася, што гэта такія ж гастарбайтары, не маюць за што жыць, таму і рабуюць людзей. Аляксей заяву пісаць не стаў. Аддаў міліцыі, сказаўшы: «Рабіце з імі, што хочаце».

**Ты грамадзянін гэтай краіны. Краіны небагатай, але ж сваёй! Тое, што атрымліваюць іншыя беларусы, можаш атрымаць і ты. А хто ты ў Расіі? Гастарбайтар.**

З часам жыццё ў Аляксея крыху наладзілася. Ён пазнаёміўся з маладой жанчынай з Малдавіі. Праз сваякоў яна ўжо мела грамадзянства Расіі і сталую працу, таму не ствarала яму праблем. І сам Аляксей знайшоў працу на будоўлі.

Будоўля шматпавярховых дамоў у Маскве — гэта цэлы свет са сваімі законамі. Працуюць у асноўным прыезджыя. Яны дзеляцца на групы па нацыянальнасці. Кожная група мае свае асаблівасці. Напрыклад, узбекі ніколі не выконваюць загад майстра ці прараба, пакуль ім гэта не паўторыць іх старэйшы. Гэта выклікае складанасці. Дзе ты будзеш увесь час шукаць іх «старэйшага»? Раздражняешся, крычыш — а толку нуль. Я спытала ў Аляксея:

— З беларусамі, напэўна, прасцей гаварыць?

— Ды пра што з імі гаварыць? — абурыўся той. — Яны ўвесь час п'яныя. А следам іх даганяюць малдаване. Пабіраюцца ў бытоўках, п'янствуюць.

— А што ж украінцы?

— О, пра гэтых не гавары. Кожны ўяўляе, што ён гетман. Ты яму не ўказвай, ён сам ведае, што рабіць...

Праца на будоўлі цяжкая, людзі розныя, да ўсяго — вялікі траўматызм. Ахова працы толькі на паперы, ды і людзі сябе не берагуць.

Беларусы часта працуюць без страхоўкі, часам выпіўшы, ім так прасцей. Страх глядзець. Безалабернасць раздражняе.

Медычнае абслугоўванне працаўнікоў на будоўлі было арганізавана такім чынам. Ёсць негалосная дамова з медработнікамі бліжэйшай паліклінікі ці бальніцы, што яны перыядычна праводзяць медагляд будаўнікоў. Плаціць ім за гэта нелегальна кіраўніцтва будоўлі. Яно не зацікаўлена праз хваробы страціць рабочых ды яшчэ нажыць праблем з уладай. А розныя дробныя траўмы кожны лечыць сам, як хоча. Хуткая дапамога выклікаецца толькі ў крытычных выпадках.

Сярод будаўнікоў трапляюцца медыкі. Аляксей сустрэў аднаго такога. Таджык. У доктара быў нялёгкі пакручасты лёс. Яму прыйшлося ўцякаць з Таджыкістана, таму што аднойчы яго выкралі і завезлі ў Афганістан. Прымушалі там працаваць задарма доктарам, лячыць афганцаў. Яму ўдалося збегчы і дабрацца за Масквы. Выдатны хірург. Ён выратаваў на будоўлі некалькі чалавек.

Асабліва запомніўся выпадак, як зваршчык апаліў горла. Ад апёку спынілася дыханне. Тут жа падбег доктар. Выхапіў нейкі штыр і зрабіў пракол шыі. Крывішча, жудасная карціна, але чалавек апрытомнеў, задыхаў. Выклікалі «хуткую». Прыехалі мясцовыя медыкі, забралі пацярпелага і просяць доктара-таджыка, каб ехаў з імі, дапамог рабіць аперацыю... Колькі розных выпадкаў было, усіх не перакажаш. Такая медыцына для гастарбайтараў...

Прайшло восем гадоў, як Аляксей быў на заробках. Дачка вырасла, зняла асобна пакой з сяброўкай, уладкавалася на працу. З жонкай разышоўся канчаткова. Пайшоў жыць да новай сяброўкі. Жонка таксама знайшла кавалера. Колькі сем'яў развалілася з прычыны паездак мужчынаў на заробкі — не злічыць. Страчаныя гады, а выніку — нуль.

У брата маёй сяброўкі ад гэтага таксама ледзь не распалася сям'я. Муж ездзіў на заробкі ў Санкт-Пецярбург, а жонка ў Слуцку сумавала. Завяла раман з міліцыянтам. Але каханы яе кінуў. Прыйшлося ўключаць мазгі, двое ж дзяцей малых трэба расціць. Тэрмінова вярнула мужа назад. Цяпер мужчына працуе ў Мінску бетоншчыкам, зарабляе каля двух з паловай мільёнаў. Кожныя выходныя праводзіць з жонкай і дзецьмі. Будуюць невялікі дом каля Слуцка. Жонка працуе. Ім усяго хапае.

Так і наш Аляксей ужо вярнуўся дадому. Як грымнуў крызіс, заробкі ў Маскве сталі затрымліваць. З цяжкасцю яму ўдалося атрымаць частку зарплаты. Грошай хапіла толькі аплаціць перавоз маёмасці ў Мінск ды зняць кватэру на месяц. З Масквы ён прывёз новую жонку і ні капейкі грошай. А дзевяць гадоў прайшло. Усё трэба пачынаць спачатку. Аформіць шлюб і від на жыхарства для жонкі. Будаваць жыллё. А гадоў ужо за сорак...

Беларусь ён спазнае наноў. Тут усё іншае, парадкі іншыя. Прыходзіцца адвыкаць ад маскоўскіх замашак. Але відаць, што чалавеку добра. Ён дома. Знайшоў працу ў прыватнай фірме. Добрая зарплата. Адразу заўважыў, што ў Беларусі да рабочых трэба мець падыход, бо яны з гонарам. А калі на два дні затрымаюць зарплату, пачынаюць абурацца. Чалавеку, якому па тры месяцы не выдавалі грошы, гэта дзіўна. Аплачваецца праязны, камандзіровачныя, яшчэ можна ўзяць 5%-ны крэдыт на будаўніцтва жылля і бясплатна схадзіць у паліклініку. Краіна цудаў! Усё таму, што ты грамадзянін гэтай краіны. Краіны небагатай, але ж сваёй! Тое, што атрымліваюць іншыя беларусы, можаш атрымаць і ты. А хто ты ў Расіі? Гастарбайтар.

Наш Аляксей любіць паўтараць: «Узбекі, узбекі». А хто ты ў Маскве? Такі ж узбек, хоць і з Беларусі.

У той месяц, як вярнуўся дамоў Аляксей, у Мінск прыехала і Ірына, былая жонка. Прывезла з заробкаў два камп'ютары і мужа-расіяніна. Таксама пачынае новае жыццё.

Засталося толькі дачакацца вяртання дачкі. Думаю, гэта не за гарамі.

**Зоя С.**

# Расія зноў за сваё

**Новы год пачаўся нафтавай вайной з Расіяй. Масква няўмольна дабіваецца стратэгічнай мэты: апанавання прывабных прадпрыемстваў Беларусі.**

Справа ў тым, што па выніках мінулага нафтавага канфлікту, у студзені 2007 года, Беларусь і Расія падпісалі пагадненне, паводле якога наша краіна мелася атрымліваць нафту па льготнай пошліне. Яе памер змяняўся. Па стане на канец 2009 года каэфіцыент складаў 0,356 ад памеру мыта, па якім нафта ідзе з Расіі на экспарт у іншыя краіны.

Такім чынам, калі агульнае мыта складала 267 даляраў за тону, то для Беларусі яна была ўсяго 95 даляраў. Розніцай распараджалася Беларусь. Гэта і складала аснову «лукашэнкаўскай эканамічнай мадэлі». Але з заканчэннем 2009 года скончылася і гэтая выгадная для Беларусі дамова, падпісаная на тры гады.

Цяпер Расія згодная выдзяляць Беларусі толькі 5—6 мільёнаў тонаў бяспошліннай нафты. «Для ўнутранага карыстання», — зазначыў расійскі віцэ-прэм'ер Ігар Сечын. Беларусі, эканоміка якой у значнай ступені трымаецца на экспарце нафтапрадуктаў, гэтага, безумоўна, мала.

«Калі не падпішуць новае пагадненне, то будуць праблемы», — сказаў 23 снежня пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў.

На навагоднія перамовы ў Маскву звыкла паслалі віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашку, але да бою курантаў ні пра што дамовіцца не выйшла. Як паведамлялі расійскія ананімныя крыніцы, беларускі бок настойваў на цалкам бязмытных пастаўках нафты. Але Сечын быў няўмольны: 5—6 мільёнаў тон без мытаў, іншае — па біржавых цэнах.

Калі перамоўшчыкі вярнуліся ў Мінск, прэс-служба ўрада распаўсюдзіла заяву, што на беларускую дэлегацыю «быў аказаны беспрэцэдэнтны ціск, што абсалютна недапушчальна. Фактычна беларускаму боку было прапанавана парушыць базавы дагавор аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі і фармаванні Мытнага саюза, што быў падпісаны кіраўнікамі трох дзяржаваў: Беларусі, Расіі і Казахстана».

Вось так афіцыйны Мінск памайстэрску стаў маніпуляваць інтэграцыйнымі пагадненнямі. Маўляў, мы для вас Мытны саюз падпісалі, які нам нявыгадны, а вам нафты шкада.

Крыніца, блізкая да нафтавых перамоваў, паведаміла «Інтэрфаксу», што беларускі бок шантажуе Расію, пагражаючы выйсці з Мытнага саюза.

«Вывад гандлю нафтай за межы канфігурацыі Мытнага саюза стварае небяспечны прэцэдэнт. За гэтым можа пайсці заданне аналагічным чынам зрабіць з газам, электраэнергіяй, а, магчыма, і з іншымі, ужо не сыравіннымі, таварамі», — мяркуе ананімны прадстаўнік кіраўніцтва Беларусі.

3 студзеня агенцтва Reuters паведаміла, што Расія цалкам спыніла пастаўку нафты ў нашу краіну, але на наступны дзень «Белнафтахім» абверг гэтую інфармацыю.

Для Беларусі атрымліваць танную нафту ад Расіі надзвычай выгадна. Паводле падлікаў эканаміста Яраслава Раманчука, у 2009 годзе доля нафтапрадуктаў у аб'ёме беларускага экспарту склала 35%. Гэта аграмадная лічба. У значнай ступені рост ВУП Беларусі за апошнія гады быў звязаны акурат з таннай расійскай нафтай.



Ігар Сечын і Уладзімір Пуцін, віцэ-прэм'ер і прэм'ер урада Расіі.

Вось чаму беларускі бок так балюча рэагуе на павышэнне цэнаў, ставячы пад сумнеў нядаўнія мытныя пагадненні. Навошта той Мытны саюз, калі цэны растуць і на нафту, і на газ.

Па стане на 4 студзеня новы кантракт так і не быў падпісаны.

Уладзімір Сямашка прапануе пакуль выбраць бяспошлінныя шэсць мільёнаў тонаў, а потым ужо абмяркоўваць новыя цэны. Летась Беларусь атрымала ад Расіі 25 мільёнаў тонаў.

Найхутчэй, беларускаму боку ўсё ж удасца выбіць нейкія льготы, але наўрад ці яны будуць у ранейшых аб'ёмах. Калі толькі Беларусь не аддасць Расіі «Нафтан».

Расія няўмольна працягвае дабівацца сваёй стратэгічнай мэты: апанавання прывабных прадпрыемстваў і аб'ектаў нерухомасці ў суседніх краінах. Саюзніцкія адносіны тут не ратуюць. Хутчэй наадварот. Украіна не аддала кантролю за сваімі газаправодамі. Беларусь жа развіталася з 50% акцый «Белтрансгаза» ў выніку папярэдняй газавай вайны.

**Зміцер Панкавец**

**Расійска-беларуская нафтавая вайна выклікала рост цэнаў на біржах**

Пра гэта паведамляе агенцтва Франс Прэс са спасылкай на заходніх аналітыкаў.

3 студзеня цана на нафту на біржы ў Нью-Ёрку NYMEX (New York Merchantile Exchange) у ходзе першай гандлёвай сесіі 2010 пераадолела адзнаку 80 даляраў за барэль. Кошт лютаўскіх ф'ючэрсаў на амерыканскую лёгкую нафту маркі Light Sweet Crude Oil падчас таргоў павысіўся на 0,78 даляра — да 80,14 даляра за барэль. Кошт лютаўскіх ф'ючэрсаў на паўночнаморскую нафтавую сумесь маркі Brent Crude Oil на лонданскай біржы ICE (InterContinental Exchange Futures) у ходзе таргоў павысілася на 0,67 даляра — да 78,60 даляра за барэль.

Эксперты звязваюць рост коштаў з інфармацыяй пра спыненне паставак расійскай нафты ў Беларусь.

**БелаПАН**

# Наш адказ Чэмберлену

**Беларусь пагражае спыніць транзіт расійскай электрычнасці ў Калінінградскую вобласць.**

Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай 4 студзеня заяве рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергіі «АДУ», якое ўваходзіць у склад дзяржаўнага канцэрна «Белэнерга».

Як адзначаецца ў заяве, «да гэтага часу расійскія энергетычныя кампаніі ААТ «ФСК ЕЭС» і «Інтэр РАО ЕЭС» не ўзгаднілі з беларускім бокам умовы транзіту электраэнергіі па тэрыторыі Беларусі для энергазабеспячэння спажыўцоў Калінінградскай вобласці і для камерцыйных паставак у краіны Балтыі».

Разам з тым, «такі транзіт расійскі бок ажыццяўляе», заяўляюць у РУП «АДУ». Па стане на 4 студзеня 2010 года аб'ём несанкцыянаванага транзіту склаў каля 39,5 млн кВт-гадз.

«Гэтыя дзеянні расійскага боку вымушаюць беларускі бок разглядаць меры па спыненні несанкцыянаванага камерцыйнага перамяшчэння электраэнергіі праз сеткі беларускай энергасістэмы, што можа паставіць пад пагрозу надзейнае энергазабеспячэнне спажыўцоў Калінінградскай вобласці, у тым ліку насельніцтва», — гаворыцца ў паведамленні.

**Андрэй Кажамякін, БелаПАН**




# Нафтавы канфлікт Расіі і Беларусі — у цэнтры ўвагі сусветных СМІ

**Апошнія гады Беларусь найчасцей трапляе ў фокус праз свае сутычкі з Расіяй.**

Так выйшла і на гэты раз.

«The Wall Street Journal» піша, што «Расія — асноўны саюзнік і спонсар Беларусі, але адносіны паміж дзвюма былымі савецкімі рэспублікамі становіцца ўсё больш напружанымі праз фінансавыя прычыны. Кабінет міністраў Беларусі заявіў у нядзелю, што не змог дамовіцца аб умовах экспарту нафты і назваў патрабаванні Масквы супярэчнымі пагадненням аб Мытным саюзе, які быў створаны ў канцы мінулага года. Беларускі ўрад таксама заявіў аб «беспрэцэдэнтным ціску» на беларускую дэлегацыю з боку Расіі, назваўшы гэта «абсалютна непрымальным».

Польская «Gazeta Wyborcza» таксама змясціла матэрыял пад назвай «Расія карае Беларусь мытамі на нафту».

«Расія хоча пастаўляць без аплаты мыта нафту толькі для ўнутраных беларускіх патрэбаў, а гэта 25% агульнай колькасці сыравіны, якую Расія пастаўляе ў Беларусь, — рэшта пасля пераапрацоўкі трапляе на Захад», — піша «Gazeta Wyborcza». У наступным артыкуле на гэтую тэму — «Беларусь змагаецца з Расіяй за танную нафту. Ці не пацерпяць польскія вытворцы?» — польская газета піша, што «новыя прапановы Расіі знішчылі ўсе дамовы па стварэнні супольнай мытнай прасторы. Спроба вывесці энергетычную галіну з-пад юрысдыкцыі Мытнага саюза ў значнай меры падрываюць дамовы аб інтэграцыі».

**Алесь Пілецкі**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА-версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Топ-15 самых сэксуальных спартовак свету

Амерыканскі спартыўны часопіс ESPN апублікаваў спіс самых сэксуальных спартсменак свету, якіх могуць чакаць поспехі ў 2010 годзе. У яго ўвайшла і беларуска Вікторыя Азаранка.



1. Элісан Сток — рэкардсменка ЗША па скачках з шостам.



2. Ліндсі Вон — амерыканская гарналыжніца, двухразовая чэмпіёнка свету.



3. Джэсіка Гісін — вялікіх спартыўных поспехаў амерыканка не дасягнула, але складальнікі назвалі яе сімвалам сусветнага валейбола.



4. Каралін Вазняцкі — вядомая дацкая тэнісістка.



5. Таніт Белбін — амерыканская фігурыстка.



6. Даніка Патрык — першая жанчына, якая выйграла гонку з серыі IndyCar.



7. Грэтхен Блейлер — амерыканская сноўбардыстка, срэбраны прызёр апошняй зімовай Алімпіяды ў Турыне.



8. Алена Весніна — вядомая расійская тэнісістка.



9. Мішэль Сунг Ві — вядомая амерыканская гальфістка.



10. Наталі Гульбіс — вядомая амерыканская гальфістка латвійскага паходжання.



11. Вікторыя Азаранка, вядомая беларуская тэнісістка.



12. Анна Роўсан — аўстралійская гальфістка і мадэлька.



13. Пола Крымер — амерыканская гальфістка.



14. Алена Дзяменцьева, вядомая расійская тэнісістка.



15. Кэйт Улендер — амерыканская спартсменка, тройчы заваёўвала бронзавыя медалі чэмпіянату свету па скелетоне (санкі).

# Усе, хто не супраць нас, — з намі

Нагодай напісаць гэты тэкст стаў поўны смутку ліст даўняй чытачкі «НН», сп-ні Валянціны Ліпніцкай з Мінска. «Вашы імёны стаяць у адным шэрагу з імёнамі А.Уласава, Янкі Купалы, А.Луцкевіча, — піша яна. — Гэта азначае, што ваша газета працягвае тую ж ідэю, мае тую ж мэту, якую мелі на ўвазе вашы папярэднікі — выдатныя сыны беларускага народа. Менавіта дзеля гэтай ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння і падпісваецца на вашу газету самая свядомая частка беларускага народа, што згаладалася па праўдзівай інфармацыі.

І што ж яна атрымлівае, узяўшы ў рукі «НН»? Атрымлівае інфармацыю, прыпраўленую пікантным «сушы на голым целе», жаночай віяграй, навінамі пра геяў, якія на Захадзе прыходзяць да ўлады...»

Гэтыя словы адлюстроўваюць горыч часткі нашых чытачоў — старэйшых, больш кансерватыўных і вельмі адданых нацыянальнай культуры і справе. Мусім патлумачыць.

Найперш, варта адзначыць рамантызаванае ўяўленне пра «НН» пачатку XX стагоддзя.

Не самі сабою фота з аголенай натурай робяць газету «жоўтай». Жаўцізна — гэта калі фота з аголенай натурай і віягра падмяняюць інфармацыю. Важную для разумення працэсаў, якія адбываюцца ў краіне і свеце. Калі чытачу накідаюць дурныя, ненатуральныя стандарты спажывання. Калі чалавек неінфармаваны, а галава ягоная задураная другасным, ім лёгка маніпуляваць.

Жыццё шматвымернае. Чалавек не можа жыць без ежы, чалавек хварэе і мусіць лячыцца, адпачываць і забаўляцца — таксама ўласціва чалавеку. Таму ў «НН», апроч абавязковых палос з палітычнай, эканамічнай інфармацыяй, актуальных каментароў, гутарак, звестак пра новыя кнігі і музыку, мы змяшчаем артыкулы пра здаровы лад жыцця, навуковыя даследаванні, сенсацыі, забавы. Арыентавацца ў масе інфармацыі чытачу дапамагаюць расстаўленыя акцэнты. Ніколі навіной тыдня ў «НН» не будзе развод Пугачовай з Кіркоравым, напрыклад.

«Наша Ніва» Уласава і Купалы таксама не была епархіяльнымі ведамасцямі. Яна была адкрытая да ўсіх праяваў сучаснага ёй жыцця. У той «НН», прыкладам, пісалі аб правах жанчынаў — скандальная, мала каму зразумелая ў тагачаснай беларускай вёсцы тэма. Там друкавалася рэклама прэзерватываў і маскоўскіх збройных магазінаў. Прычым па-расійску — відаць, такім было патрабаванне рэкламадаўцаў. Калі б тагачасныя тэхналогіі дазвалялі масава прадукаваць фота, выдаўцы «НН», пэўна, не абыходзілі б увагай і фотавыявы, якія шаноўная чытачка называе «пікантнымі». Бо і яны прыцягнулі б увагу чытачоў.

Усё гэта не перашкаджала, а дапамагала той газеце стаць асновай для беларускіх граматык і кадравай школай палітыкі першай паловы XX ст. Менавіта дзякуючы сваёй адкрытасці, полівалентнасці, дзякуючы таму, што «НН» абвясціла сябе газетай не для мужыкоў і не для паноў, а для ўсіх, яна здолела акамуляваць найлепшыя нацыянальныя сілы.

У пачатку XX стагоддзя не было пагрозы знікнення беларускай мовы. На ёй гаварыла ўся гіганцкая сялянская Беларусь. Галоўнай задачай тых нашаніўцаў была кансалідацыя носьбітаў гэтай мовы ў супольнасць. Пра нацыянальную дзяржаву за царом нават не марылася ўголас.

Сёння маем сучасную, невялікую, але моцную беларускую супольнасць. Маем і нацыянальную дзяржаву. Але гэтая дзяржава збудаваная так, што можа цалкам функцыянаваць без беларускай мовы. Няма патрэбы яе вучыць у школе, каб працягнуць адукацыю. Няма дзяржаўнай установы, куды цябе не ўзялі б без ведання мовы. Нават у найвышэйшых чыноўнікаў няма патрэбы гаварыць па-беларуску.

Стаіць першарадная задача падтрымання мовы, яе развіцця і стварэння перадумоваў для яе пашырэння, каб давершылася тварэнне беларускай нацыі.

Стратэгічнай памылкай было б абраць шлях біблейскіх фарысеяў. Замкнуцца ў сваім коле. Абвясціць сябе апошнімі носьбітамі сапраўднай ідэнтычнасці.

Самаізаляваную газету не трэ было б зачыняць. Пра яе існаванне проста забылі б. Прыклады — навідавоку.

Наша тактыка — іншая. Мы кажам: «Усе, хто не супраць нас, — з намі». Усе, хто хоча размаўляць па-беларуску, вучыць родную мову ці хоць бы не забываць яе, падтрымліваць яе веданне на элементарным узроўні, хай чытаюць «НН». І хай кожны, хто мае хоць кроплю жадання чытаць па-беларуску, знаходзіць у «НН» штосьці сваё. Друкуючы артыкулы на «лёгкія» тэмы — стыль жыцця, рэцэпты, здароўе, — мы замацоўваем мову ў штодзённасці. Лепш надрукаваць адзін рэцэпт, газета з якім трапіць у рукі расійскамоўнай гаспадыні, чым пяць правільных артыкулаў пра патрэбу любіць мову. Бо такія не будзе чытаць нават самая традыцыяналісцкая аўдыторыя: людзі пабачаць загалоўкі і са спакойнай душой перагорнуць старонку.

Сёння яшчэ было б занадта вялікай раскошай для беларускамоўнай газеты ў незалежным сектары — адкідаць частку аўдыторыі: кансерватыўную або ліберальную, рэлігійную ці свецкую, старэйшую ці маладзейшую. Мы мусім знаходзіць кропкі судакранання.

У становішчы культурнай дыскрымінацыі беларуская газета для многіх чытачоў — адхланне. Яна мусіць, у нейкім сэнсе, ліць бальзам на раны, нанесеныя штодзённым уціскам усяго беларускага праз пануючую савецкую культуру. Уціскам усяго праўдзівага, усяго сумленнага, прынцыповага карумпаваным, цынічным постсавецкім рэжымам. Але не менш важная задача — паказваць чытачу, як змяняецца свет і краіна, які складаны чалавек і збудаванае ім грамадства. Не маляваць рэальнасць чорнабелай, бо яна не такая, а ўважліва адсочваць нюансы.

Сцверджанне, што ўсе з'явы, якія газета гнеўна не асуджае, яна аўтаматычна ўхваляе, былі справядлівыя ў дачыненні да прапагандысцкіх савецкіх газет. Мы не прапагандуем і не асуджаем. Мы паказваем чытачам праблемы.

Якраз з гэтым перагукаецца другі закід на адрас «НН»: «Было прыкра чытаць у вашай газеце асуджаючыя радкі пра ксяндза Бульку, якія і давялі яго, хутчэй за ўсё, да рэанімацыі. ...І ўжо адно тое, што пасля вайны ён зрабіў выбар у напрамку цнатлівага жыцця духоўнай асобы, кажа нам пра тое, што душа ў яго была чыстай і ён не падлягае асуджэнню. ... Вы павінны рэабілітаваць гэтага чалавека — надрукаваць праўдзівы артыкул, адлюстроўваючы дабро, звязанае з яго імем. Калі вы гэтага не зробіце, то гэта будзе азначаць, што газета Янкі Купалы стала звычайнай жоўтай газетай, сэксуальна заклапочанай, што і закрывае ёй вочы на ўсё чыстае і праўдзівае».

У нашых матэрыялах пра ксяндза Юозаса Бульку мы не адмаўляем ягонай вялікай ролі ў арганізацыі мясцовага жыцця ў Мосары. Таксама ў іх няма абвінавачанняў на яго адрас, якія сыходзілі б ад «НН». Але мы лічым згубнай і крывадушнай практыку абмежавання інфармацыі. Калі ксёндз ігнаруе беларускую мову, лічыць беларускую культуру малаважнай, трэба пра гэта пісаць. Калі за ксяндзом цягнецца шлейф неадказаных пытанняў, пра гэта варта расказваць. Газета мае быць пляцоўкай для абмеркавання цікавай людзям праблемы, нават калі яна балючая.

Аб тым, што гісторыя айца Юозаса Булькі цікавая, сведчыць хоць бы тое, што на сайце «НН» матэрыялы на гэтую тэму набіралі болей за пяць тысяч прачытанняў і сотні каментароў рознага характару. Газета падае на сваіх старонках розныя меркаванні. Бо гэтыя розныя меркаванні існуюць.

«НН» застанецца люстэркам жыцця. Усё, што Вы бачыце ў газеце, ёсць у жыцці сённяшняга беларускага грамадства. Або было ў жыцці ўчарашняга. Або будзе ў жыцці заўтрашняга.

**Рэд.**

## Пане Рэдактару, адзін дыктатар каторы раз спытаўся нашых творцаў: «Дзе вашы шэдэўры?»

**На жаль, пісьменнікі змаўчалі.**

Падаю ўзор адказу на такое пытанне. Вось што піша ў сваёй кніжцы «Una monarquia protegida por la censurai» («Манархія пад апекаю цэнзуры», Мадрыд, 2008).

Пасля падзення Мадрыда на судзе, больш падобным да фарсу, суддзі спыталі старшыню іспанскіх Картэсаў (парламента) Хуліяна Бэсцьера, дзе знаходзіцца золата Іспаніі.

«Золата Іспаніі, — адказаў ён, — валяецца ў прыдарожных канавах, ляжыць на могілках, сядзіць па турмах і ў выгнанні. Вось дзе золата Іспаніі».

Неўзабаве пасля гэтага Бэсцьер загіне ў турме Кармона.

Перакладзены на нашу рэчаіснасць і глебу адказ пісьменнікаў дыктатару мусіў бы гучаць прыкладна так:

«Нашы шэдэўры ляжаць у Курапатах і Лошыцы, у парку Чалюскінцаў. Нашы шэдэўры ляжаць у Сібіры, Комі і ў Карэліі. Яны сапрэлі ў засценках КГБ і згарэлі ў двары амерыканкі. Яны змарнелі ад страху дома і ў выгнанні. Вось дзе нашы шэдэўры».

**Мікалай Бусел, Volksleser, Дуброва (Светлагорскі раён)**

## Ліст з войска ад саслужбоўца Франака Вячоркі

**Я вельмі ўдзячны Франаку Вячорку за тое, што цяпер напэўна ведаю, за што змагацца.**

Колькі можна хваліць наша войска. Тое, што пішуць пра яго ў газетах, — поўная хлусня.

Як служыць, калі паўсюль брудная вада, дрэнная ежа, дзедаўшчына.

Дзедаўшчына — тэма вельмі балючая, бо закранае не адну часць. Нават на заробак у некалькі дзясяткаў тысяч рублёў так званыя дзяды прымушаюць салдата нешта браць ім у краме. Так павялося ў беларускіх узброеных сілах: без грошай зараз і продыху не будзе.

Але і гэта не самае цікавае ў арміі. Ёсць жа яшчэ медыцына. Ёсць афіцэры, якія зялёныя прыйшлі з Акадэміі. Там іх нават не вучылі, як звяртацца да салдатаў. Яны стаяць расшпіленыя, рукі ў кішэнях, а шапка нават не на патыліцы — у некаторых яе наогул няма. Вось такія ў нас афіцэры.

Цяжка змяніць сістэму, якая захоўвалася гадамі. Але я лічу, калі мы працягнем змагацца, урэшце гэта ўсё выправіцца.

Я вельмі ўдзячны Франаку Вячорку за тое, што цяпер напэўна ведаю, за што змагацца. Пакуль буду служыць, буду змагацца, каб усе нарэшце зразумелі: дзедаўшчына нас праглыне, калі ёй не супрацьстаяць.

**Грыша, Мазыр**

## Сэкс-турызм па-гарадскому

**Кожны раз, калі адпачываем за мяжой, назіраем такую карціну: нашы дзяўчаты ў Італіі ці Іспаніі шукаюць сабе казановаў.**

У «НН» за 16 снежня 2009 г. прачытала артыкул «Сэкс-турызм па-беларуску». Пра тое, як дзяўчаты ў інтэрнаце БДУ прапануюць сябе за грошы студэнтам-арабам.

Мы з мужам жывём у шлюбе больш за дваццаць гадоў. Для сучасных дзяўчат гэта смешна. Для шмат каго і дваццаць дзён з адным хлопцам — рэкорд. А мы жывём разам, любім падарожнічаць, часта адпачываем у Еўропе.

Кожную паездку назіраем такую карціну: нашы дзяўчаты пачынаюць гойсаць па пляжы ў пошуках казановы. Набегаўшыся без вынікаў, кладуцца радком каля прахадной зоны (абавязкова топлес) і пачынаюць зіркаць вачыма.

Калі хлопец з краін былога Саюза іх зачэпіць, атрымае жорсткі адказ. Твары дзяўчат робяцца злыя, словы грубыя, вульгарныя. Затое калі з'яўляецца цыбаты рыжы немец, дзяўчаты зіхацяць ласкавымі ўсмешкамі, голас пяшчотны, манеры вытанчаныя. Сястрыцы-Алёнушкі з вядомай казкі. Спачатку немец, пасля пара стараватых італьянцаў з роду шукальнікаў прыгод, пасля яшчэ замежнік з кактэйлем. І нашы гарадскія дзяўчаты праводзяць з імі ночы. За кароткі тэрмін адпачынку (дзесяць дзён) ім трэба паспець зрабіць тры-чатыры заходы. Спадзяюцца, што колькасць перарасце ў якасць. Спаць з арабамі за грошы — гэта па-вясковаму, а з італьянцамі-іспанцамі за кактэйль — гэта па-гарадскому.

Мой знаёмы італьянец Фелічыё кожны год прыязджае у Беларусь з пэўнымі мэтамі. Спыняецца ў Мінску, бывае і ў Барысаве. На прывабнага замежнага турыста заўсёды знойдзецца пара прыгожых гарадскіх дзяўчат, гатовых на ўсё. Такі вось сэкс-турызм па-гарадскому. Уся толькі розніца, што вясковыя дзяўчаты прапануюць сябе ў інтэрнаце ў межах радзімы, а гарадскія вывозяць усё на паказ за мяжу. Хто з іх лепшы — вырашайце самі.

Выснова: праблемы з мараллю не залежаць ад месца нараджэння. Яны — у галаве.

**Зоя С., Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Еўропа перайшла на электронныя кнігі

Упершыню паводле продажаў электронныя кнігі (e–books) пераўзышлі сваіх папяровых прабацькоў.



**Электронныя кнігі — агульная назва кампактных прыстасаванняў, прызначаных для адлюстравання тэксту, прадстаўленага ў электронным выглядзе.**

Сёлета ў Еўропе самым папулярным падарункам на Каляды сталі кнігі. Прычым у новай тэхналогіі.

Электронныя прыстасаванні для чытання Amazon Kindle ў перадкалядны сезон сталі самым папулярным падарункам, якія набывалі ў вядомай сусветнай інтэрнэт-краме Amazon. Каштуе такі падарунак 259 даляраў, а мадэль Amazon Kindle DX, большая па памеры і з большай колькасцю функцый, — 489 даляраў. Электронныя кнігі даступныя і беларускім пакупнікам. Праўда, у нашых інтэрнэт-крамах яны не такія папулярныя ды каштуюць даражэй за еўрапейскія — кошт мадэлі PocketBook складае прыкладна 350—400 даляраў, мадэлі LBook eReader V3 — 390 даляраў, патрыманы e-book можна знайсці па кошце, меншым у два разы.

Электронныя кнігі — агульная назва кампактных прыстасаванняў, прызначаных для адлюстравання тэксту, прадстаўленага ў электронным выглядзе. Таксама электроннымі кнігамі называюць версіі кніг ў лічбавым фармаце. Іх гісторыя пачалася ў 1998 годзе, калі кампаніі NuvoMedia і Softbook Press выпусцілі першыя прыстасаванні з манахромнымі LCD-экранамі. Пад'ём рынку электронных кніг прыпаў на 2007 год. Гэта адбылося ў сувязі са з'яўленнем экранаў з тэхналогіяй электроннай паперы (тэхналогія, якая імітуе звычайны друк на паперы). Пакуль электронныя кнігі паводле папулярнасці значна саступаюць смартфонам і кішэнным камп'ютарам.

**Вольга Жарнасек**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Зміцер Вайцюшкевіч прэзентуе беларускі альбом і працуе над шведскім

Спявак расказаў пра новыя праекты.

— 2009 год быў даволі насычаны. Ішла праца з польскім альбомам. І яна амаль скончаная. Выдадзены супольны музычны праект, які называецца «Мой сябра Анёлак». Распачатая праца са «Шведскім альбомам» — на вершы шведскіх паэтаў у перакладах на беларускую. Пераклады зрабілі такія знаўцы паэтычнага слова, як Рыгор Барадулін і Алесь Разанаў. Яшчэ мы запісалі ў Польшчы альбом супольна з тамтэйшым фальклорным ансамблем Czeremszyna. Альбом выйдзе праз пару месяцаў.

**Prastora.by**

# Слоўнік ад Баршчэўскіх

Алена і Лявон Баршчэўскія падрыхтавалі арфаграфічны слоўнік. Ён складзены па новых правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, якія ўступаюць у сілу з 1 верасня 2010 года.

Гэта будзе дапоўненае перавыданне слоўніка, які склала Алена Баршчэўская. У папярэднім выданні налічвалася 35 тысяч словаў. Сп. Лявон дадаў яшчэ амаль 7 тысяч. Адметнасць слоўніка ў тым, што цэлы раздзел у ім прысвечаны правільнаму напісанню замежных асабовых іменаў. «Такога да нас яшчэ ніхто не рабіў. Гэта, праўда, толькі раздзел. Але варта было б зрабіць асобны слоўнік. Мо калі і вазьмуся», — кажа сп. Баршчэўскі. Ён спадзяецца, што чыноўнікі з Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы на іх працу «крывіцца не будуць». Хоць дырэктар гэтай установы Аляксандр Лукашанец і падкрэслівае, што сапраўднымі з'яўляюцца толькі тыя слоўнікі, што выдаюцца пад грыфам інстытута.

**Кастусь Матушчыц**

# Льюіс Кэрал па-беларуску ў новым ARCHE

Гэты ARCHE, у адрозненне ад серыі амаль цалкам гістарычных папярэдніх нумароў, быў аддадзены на водкуп літаратарам. У іх ліку — Віктар Марціновіч з наскандаленым раманам «Параноя». У ARCHE друкуецца ўрывак твора па-беларуску.

А яшчэ, пасля колькігадовага перапынку, ARCHE завяршае пачатае: публікуе другую частку льюіскэралаўскай класікі. (Нагадаем, раман «Алесіны прыгоды ў цудоўнай краіне» ў перакладзе Максіма Шчура друкаваўся ў ARCHE №2'2002). Пра прыгоды Алісы-Алесі можна пачытаць сабе і дзеткам у вытанчаным перакладзе Веры Бурлак — «Скрозь Люстэрка, і што ўбачыла там Аліса».

Са сваёй прозы ў нумары: урывак з новага рамана «Шалом» Артура Клінава, фантасмагорыя ад Аляксея Бацюкова, вясёлы постмадэрн ад Сяргея Балахонава пра беларускія карані героя відэагульняў вадаправодніка Марыё, а таксама нізкі вершаў Андрэя Хадановіча, Вальжыны Морт, Марыі Мартысевіч і Віталя Рыжкова.

**Лявон К**




# Новая кніга Дзядзькі Рыгора называецца «Навошта»

Яна аздобленая здымкамі амерыканскага дыпламата і фотамастака Джона Кунстадтэра.

Беларускія вершаказы, запачаткаваныя яшчэ Алесем Разанавым, — згусце паэтычнай мудрасці, зашыфраванае ў кароткія, амаль тэлеграфічныя словаспалучэнні, якія вядуць свой радавод ад пазачасовых трапнасцяў старазапаветных пракокаў, ад зачараванага трапяткой прыродай японскага хоку і ад сцюдзёнай вытанчанасці сярэднявечных афарызмаў.

Буслянкі, крыжы, бабулькі-сялянкі і сцэны з вясковага жыцця, знятыя амерыканскім фатографам Джонам Кунстадтэрам, — адно праваднікі ў свет сталай барадулінскай паэзіі, у высокачастотны мысленчы рэгістр, дзе заміраванне прыродай і светам рэчаў нябачна узносіцца ў заміраванне людствам.

Джон Кунстадтэр працаваў намеснікам амбасадара ЗША ў Беларусі ў 2000-2001 гг. Вялікі аматар фота, ён зрабіў цэлую калекцыю фотаздымкаў беларускіх краявідаў, пабачыць якія можна на сайце radzimaphoto.com.

**Лявон К, СП**




**Рыгор Барадулін. Навошта: вершаказы.** Уклад. Алесь Камоцкі. Фотамастак Джон Кунстадтэр. — Мінск: Медысонт, 2009. — 162 с., 1000 ас.




# Выйшаў грэка-каталіцкі «Царкоўны каляндар 2010»

Сёлета каляндар прысвечаны Жыровіцкай Іконе Багародзіцы. У ім змешчаныя розныя спіскі абраза і выявы царкваў, дзе яны захоўваюцца.

Таксама вернікі знойдуць літургічны календарыум.

Традыцыйна высокаякаснае выданне можна атрымаць за ахвяраванне ў грэка-каталіцкіх парафіях.

**Даведкі праз svjazep@gmail.com**

# Адрыўны каляндар на 2010 (з птушачкамі)

Выйшаў традыцыйны адрыўны каляндар «Родны край» на 2010 год.

Сёлета ў афармленні календара стваральнікі адступіліся ад традыцыйных арнаментаў і выявілі птушачак, вытрыманых у нацыянальнай бела-чырвонай палітры.

Нагадаем, што ў 2007 годзе выдавецтва «Беларусь» адмовілася ад друку календара з эканамічных прычынаў. Тады галоўны рэдактар выдавецтва Якуб Аляксейчык паведаміў, што «Родны край», маўляў, кепска прадаецца. Пад ціскам Таварыства беларускай мовы (яны рабілі шматлікія звароты) летась выпуск календара «Родны край» быў адноўлены. Ён выйшаў накладам 7 тысячаў асобнікаў.




Сёлетні ж тыраж вырас амаль удвая: 13 тысячаў асобнікаў, якія можна набыць у кожнай кнігарні за 2800 руб.

Варта адзначыць, што прыгожыя беларускамоўныя календары на 2010 год выпусцілі таксама незалежныя кнігары. Яны прысвяцілі каляндар 600-годдзю Грунвальда. Гэтыя, а таксама царкоўныя календары пытайцеся ў інтэрнэт-кнігарнях Prastora.by і Knihi.net, на кніжным кірмашы на Янкі Купалы і ў незалежных кніганошаў.

**ЛК**

# Даўняя спрэчка пра малако

Пра сувязі генетыкі і харчавання на прыкладзе беларусаў піша **Алег Дзярновіч**.

Умовы жыцця і традыцыі харчавання маюць уплыў на фізіялагічныя асаблівасці. Гэтую залежнасць можна перавесці на мову навукі. Апошнія даследаванні генетыкаў дазваляюць лепш зразумець даўнія культурныя і біялагічныя працэсы.


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Малако — не для ўсіх

Дзеля нармальнага засваення такога даўняга еўрапейскага напою як малако, чалавеку патрэбны асобны фермент — *лактаза*, які расшчапляе малочны цукар *лактозу*. Гэты складаны па сваёй структуры цукар забяспечвае да 30% энергетычнай вартасці малака — астатні ўнёсак робяць тлушчы і бялкі. Для сысуноў характэрна тое, што ў кішэчніку дзіцяці ў працэсе сталення выпрацоўка гэтага ферменту скарачаецца. Працуе адаптацыйны механізм, які прымушае дзіця паступова адмаўляцца ад матчынага малака ды пераходзіць да дарослай ежы. Дарослы чалавек фізіялагічна не прыстасаваны да ўжывання малака. Але еўрапейцы складаюць тут пэўны феномен: у іх захоўваецца высокая актыўнасць ферменту лактазы і здольнасць піць малако ў сталым узросце.

## Спецыфіка еўрапейцаў

Першым паспрабаваў патлумачыць гэту з'яву амерыканскі даследчык Маккрэкер у пачатку 1970-х. Ён лічыў, што актыўнасць фермента лактазы — вынік натуральнага адбору ў народаў, якія займаліся малочнай жывёлагадоўляй.

Паводле тэорыі Маккрэкера, на мяжы IV—III тыс. да н. э. у жыцці індаеўрапейцаў адбыліся змены, выкліканыя цыклічнымі ваганнямі клімату, — моцна пахаладнела, клімат стаў кантынентальны, спякотнае лета чаргавалася з суровай зімой. Земляробства перастала забяспечваць прадуктамі, затое жывёлагадоўля, у тым ліку малочная, набывала ўсё большае значэнне. Павелічэнне статкаў патрабавала новых пашаў. Так пачаўся перыяд асваення суседніх земляў.

Але гэтая тэорыя не знаходзіць археалагічнага пацвярджэння. Калі меркаваць па знаходках шкілетаў буйной рагатай жывёлы на стаянках старажытных людзей, у Еўропе малочная жывёлагадоўля з моманту яе зараджэння і да ранняга Сярэднявечча пашыралася з поўдня на поўнач. А працэнт нашых сучаснікаў, што маюць фермент лактазы, што расшчапляе малако, нарастае з паўднёвага ўсходу на паўночны захад. Мінімальная колькасць людзей, няздольных засвойваць малочны цукар, жыве ў Швецыі, Даніі, Нідэрландах і Вялікабрытаніі (ад 1% да 6% прадстаўнікоў гэтых этнічных груп). Наадварот, у насельніцтва тэрыторый, блізкіх да зонаў прыручэння буйной рагатай жывёлы на Блізкім Усходзе і Індастане, багата людзей з абмежаванай актыўнасцю гэтага ферменту.

Такім чынам, гіпотэза Маккрэкера не атрымала пацверджання. У раннім каменным веку здольнасць спажываць цэльнае малако была рэдкай сярод дарослых еўрапейцаў. Пра тое кажа аналіз ДНК з людскіх парэшткаў, знойдзеных на ранненеалітычных паселішчах Усходняй Германіі, Польшчы і Літвы.

## Замест вітаміну D

Занадта прасталінейную трактоўку «жывёлагадоўчай» канцэпцыі пачалі крытыкаваць адразу ж пасля яе ўзнікнення. Навукоўцы даводзілі, што здольнасць засвойваць малако — экалагічна адаптацыйная прыкмета. Спажываючы малако, чалавек атрымлівае кальцый ва ўмовах дэфіцыту вітаміну D — пры недахопе ўльтрафіялетавага апраменьвання, прасцей кажучы, сонца. А гэта і ёсць паўночнаеўрапейская зіма.

Асноўная функцыя вітаміну D — забеспячэнне нармальнага развіцця костак ды перадухіленне рахіту. Вітамін D унікальны, ён адзіны дзейнічае і як вітамін, і як гармон. Дэфіцыт вітаміну D — з'ява даволі пашыраная і можа выклікаць праблемы росту клетак органаў. Навукоўцы таксама выказваюць думку, што доўгатрывалы дэфіцыт вітаміну D выклікае рак.

Эксперыментальна даказана, што лактоза цэльнага малака спрыяе засваенню кальцыю, фізіялагічна дапаўняе дзеянне вітаміну D. Даказана, што ў рэгіёнах умеранай кліматычнай зоны, з невысокай інтэнсіўнасцю сонечнага апраменьвання, болей людзей, здольных засвойваць малако.

Такім чынам, малако стала ў рэгіёнах, бедных ультрафіялетам, заменай вітаміну D. Народы паўднёвых рэгіёнаў Еўропы (іспанцы і італьянцы) таксама ўжываюць цэльнае малако, але ў меншым аб'ёме. У іх рацыёне пераважаюць сыры і кісламалочныя прадукты, якія ўтрымліваюць менш малочнага цукру. Развіццё сыраварства можна разглядаць таксама як прыстасаванне да клімату — у цеплыні малако доўга не захоўваецца.

## Памылка Альендэ

Уяўленне пра тое, што тыповае для еўрапеоідаў — норма і для іншых народаў, звяло ў 1970-я на нішто праграму дапамогі найбяднейшым, пераважна індзейскім, сем'ям Чылі. Гэтую праграму рэалізоўваў прэзідэнт Чылі ў 1970—1973 гг. сацыяліст Сальвадор Альендэ, сам медык-педыятр паводле адукацыі. Сацыяльная праграма Альендэ ўключала ў сябе лозунг «Кожнаму дзіцяці — шклянку малака ў дзень!»

У той час яшчэ не было вядома, што дзеці амерыканскіх індзейцаў вельмі рана губляюць здольнасць да выпрацоўкі ферменту лактазы. Адсутнічае яна і ў дарослых. Нічога дзіўнага: продкі індзейцаў пакінулі Паўночна-Усходнюю Азію праз так званы «Берынгаў мост» — старажытны перашыек між Амерыкай і Азіяй на месцы сённяшняга Берынгава праліва. Той мост знік больш за чатырнаццаць тысяч гадоў таму. Узнікненне ж жывёлагадоўлі лічаць адной з фундаментальных рысаў «неалітычнай рэвалюцыі». А першыя культуры неаліту з'явіліся каля 7 тыс. гадоў да н.э., калі амерыканскія індзейцы асвойвалі новыя прасторы.

Таму нашчадкі старажытных перасяленцаў, чылійскія індзейцы, хварэлі ад «дапамогі» Альендэ.

У Савецкім Саюзе таксама не было вядома, што ў карэнных народаў Сібіры дзеці, і тым больш дарослыя, не пераносяць малака. Тых дзяцей звозілі ў інтэрнаты, дзе давалі ім «здаровае» харчаванне, у тым ліку малако. Дзеці хварэлі, але замест змены рэжыму харчавання іх нашпігоўвалі антыбіётыкамі ад кішэчных інфекцыяў.

## А што беларусы?

У сярэдзіне XIX ст. жыхарка Барысаўскага павета Ганна Цюдзявіцкая ў сваёй кнізе парад «Літоўская гаспадыня» пісала, што «таму, хто жыве недалёка ад горада ці мястэчка, непараўнальна выгадней прадаваць свежае малако..., чым масла і сыр (іх робяць толькі з малочных прадуктаў, якія не ўдалося збыць)». Аграрны крызіс 1880-х, калі параходы з Аргенціны і паравозы з Украіны напоўнілі свет танным збожжам, паказаў нерэнтабельнасць традыцыйнага земляробства ў Беларусі. На адаптацыю да новых умоваў спатрэбілася дваццаць гадоў, на працягу якіх жывёлагадоўля, найперш малочная, стала асноўнай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі.

Гістарычна беларусы апынуліся на мяжы розных зон ужывання малака. Як паўночныя еўрапейцы, беларускія дзеці добра ператраўляюць гэты напой. Хоць каля 39% дарослага насельніцтва мае першасную гіпалактазію — не ўспрымае малочнага цукру (лактозы). Папросту ім непрыемна піць цэльнае малако. Адносна парашковага, а толькі такое мы можам набыць у крамах, працэнт непераноснасці рэзка змяншаецца. У гэтай статыстыцы беларусы ідуць услед за літоўцамі ды палякамі (гл. табліцу). Сярод расіянаў існуе вялікі разнос лічбаў — у залежнасці ад рэгіёна. Вось як можна размеркаваць народы паводле фізіялагічнай непрыхільнасці да малака:

**Фізіялагічная непрыхільнасць да малака ў розных народаў**

| | % насельніцтва |
|---|---|
| Шведы | 1 |
| Галандцы | 2 |
| Датчане | 3 |
| Ірландцы | 4 |
| Англічане | 6 |
| Немцы | 15 |
| Фіны | 17 |
| Эстонцы | 23—28 |
| Літоўцы | 30—37 |
| Венгры | 37 |
| Французы | 37 |
| Палякі | 37 |
| Беларусы | 39 |
| Расіяне (славяне) | 36—53 |
| Украінцы | 42 |
| Грэкі | 45—66 |
| Італьянцы | 50—70 |

Беларусы ўваходзяць у групу народаў, для якіх ужыванне малака традыцыйнае, і арганізмы большасці прадстаўнікоў этнасу прыстасаваныя да такога прадукту. Хоць беларусы, як і іх суседзі, у здольнасці спажываць малако выразна саступаюць паўночна-заходнім еўрапейцам.

На 100 % непрыстасаваныя да піцця малака японцы і кітайцы Тайваня. У Паўночным Кітаі ўжо 8 % насельніцтва можа піць малако. Не трываюць малака і 79—87 % казахаў, таму на экспарт беларускай малочнай прадукцыі туды ў рамках Мытнага саюза не даводзіцца моцна спадзявацца.

# Антон Луцкевіч і ягонае «падвойнае жанімства»

Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Ужо даўнавата я прачытаў у адным тэксце доктара Алега Латышонка, што Антон Луцкевіч быў двойчы жанаты. А з тае прычыны, што рымска-каталіцкая Царква не давала разводу з першаю жонкай, перайшоў у кальвінізм. Тады я не занатаваў крыніцу інфармацыі. І вось цяпер маю кнігу д-ра А. Латышонка «Нацыянальнасць — Беларус».

Кніга выйшла ў той самай серыі, што і грунтоўныя тамы твораў доктара Юрыя Туронка, ксяндза Адама Станкевіча і таго ж Антона Луцкевіча. А перад кнігаю «Нацыянальнасць — Беларус» у серыі свет убачыла кніга таго самага аўтара «Жаўнеры БНР».

Абяцаючы вярнуцца да кнігі «Жаўнеры БНР», зараз я хачу спыніцца на момантах, якія найбольш закранулі мяне ў кнізе «Нацыянальнасць — Беларус».

У артыкуле «Беларускія палітыкі і пратэстанты. Ад «Гомона» да Грамады» я знайшоў тую цытату пра падвойнае жанімства і пратэстантызм А. Луцкевіча. Аўтар піша, што ў сярэдзіне 1920-х А. Луцкевіч быў ужо пратэстантам. Далей цытую: «Праўду кажучы, ён перайшоў у кальвінізм па фармальных прычынах (развод і другі шлюб) і сапраўды быў атэістам».

Што А. Луцкевіч, перакладчык (разам з баптысцкім пастарам Лукашом Дзекуцем-Малеем) Новага Запавету і Псалмаў на беларускую мову, быў атэістам — гэта шчырая праўда. Але выклікае пярэчанне сцверджанне аўтара пра развод і другі шлюб А. Луцкевіча. Наколькі мне вядома, А. Луцкевіч у канцы 1919-га ці то на пачатку 1920-га ажаніўся першы і адзіны раз з выпускніцай Сарбоны доктарам Зоф'яй Абрамавічанкай.

А. Луцкевіч ведаў панну Зоф'ю і да сусветнае вайны, бо ў Вільні ў той час усе ведалі ўсіх. Можна меркаваць, што ў час побыту ў Парыжы (чэрвень–жнівень 1919 года) ён пазнаёміўся з паннай Зоф'яй бліжэй. Яна была значна маладзейшая за А.Луцкевіча і прыгожая. Сам жа А.Луцкевіч у 1919 годзе быў ужо ва ўзросце «шляхецкага кавалера» — яму споўнілася трыццаць пяць. (Тагачасныя шляхцічы жаніліся і пазней. Прыкладам, Ян Баляслаў Луцкевіч, Антонаў бацька, першы раз стаў пад вянец у сорак тры.)

А. Луцкевічу падабалася панна Зоф'я Абрамавічанка, а панне Зоф'і, мусібыць, падабаўся красамоўны «версальчык» (так за шляхетныя манеры А. Луцкевіча называў адзін з ягоных вучняў). Але на перашкодзе стаялі Царква і родзічы Луцкевіча. Радня паўстала супраць шлюбу Танюська (на польскі лад Антона называлі ў сям'і Toniusiek) з габрэйкай. Царква ж не магла ўдзяліць намінальнаму каталіку Луцкевічу таемства шлюбу з юдэйкай. Упарты і відавочна закаханы Танюсек ігнараваў пратэсты сям'і і забарону ксяндзоў. Паколькі ў той час шлюб мог быць толькі царкоўны, намінальны каталік стаў намінальным пратэстантам.

Кальвінская царква ў Вільні месцілася ў той час ў будынку на Завальнай, у якім за саветамі быў кінатэатр Kronika. Там, дарэчы, былі ахрышчаныя абодва сыны Антона і Зоф'і Луцкевічаў. У 1980-х Юрка і Лявон Луцкевічы жартавалі, што іх хрысцілі ў кінатэатры.




**Латышонак Алег. Нацыянальнасць — Беларус.** Беласток— Вільня, 2009. — 558 с.

# Ваўкалак

**Марыя Роўда.** Апавяданне.

## 1.

У кожнай жанчыны ёсць свой ваўкалак. Мужчына, які будзе ісці да яе праз ноч, а потым шукаць неабходны пад’езд і, як дваццаць гадоў таму, памыляцца. Напачатку яго будзе выручаць дыванок — «Алімпіяда-80» з мішкам. Гадоў праз колькі ўжо і ў пад’езд не трапіш: нават у старых пяціпавярховіках, населеных калдырамі ўсіх масцей і пакаленняў, паставяць прымітыўныя дамафоны. Дый дзяўчына ўжо даўно не будзе жыць у гэтым доме, а па тэлефоне будзе адказваць незнаёмы стомлены голас. Нумар мабільнага застанецца невядомым, бо гісторыя кахання пачалася і скончылася яшчэ тады, калі не трэба было тэлефанаваць, а дастаткова было з’явіцца ў пэўным месцы ў пэўны час. На паказе японскіх фільмаў, на джазавым сэйшне, у падвальнай кавярні ў Траецкім. Цяпер усё інакш — яны ўжо не ўпалююць адзін аднаго, бо змяніліся і час, і месца.

Ваўкалак пастаіць пад чужымі вокнамі. Ён па-ранейшаму будзе паліць, хоць яна, маючы дваіх дзяцей, свядома кіне. Ён паназірае праз цыгарэтны дым за чорнымі, засяроджанымі на сабе галінамі і тлумным жыццём за гардзінамі. Снег нападае шапкай на густыя яшчэ валасы, і яна ўжо не страсе яго дбайнай рукой.

З папярэдняга пад’езда выйдзе жанчына з вядром. У халаце, зімовым абутку, цёплай куртцы. Будзе выносіць смецце. Мінаючы ваўкалака, яна пазнае яго і павітаецца. Ён кіўне галавой. Жанчына спыніцца і скажа: «Яна пераехала. Тут нічога не мяняецца — усе паціху співаюцца, але яна тут даўно не жыве». Ваўкалак здзівіцца, але потым здагадаецца, што гэта тая самая жанчына, якой ён не даваў спаць дваццаць гадоў таму. Ноччу ён памылкова званіў ў дзверы яе кватэры, жанчына адмыкала і нязлосна тлумачыла: «Яна жыве ў наступным пад’ездзе». Ваўкалак выбачаўся, развітваўся, дзёўбся на спозненае спатканне. У наступным пад’ездзе ён быў больш асцярожным і амаль цвярозым — глядзеў пад ногі, правяраў, ці ляжыць патрэбны дыванок.

Жанчына ссутулена рушыць да сметніцы. Цяпер гэнай цётцы мусіць быць гадоў пад пяцьдзясят. Раней ваўкалаку здавалася, што гэта старэчы ўзрост, а цяпер яна сышла б за ягоную аднагодку — толькі пашарпаную і прыбітую жыццём.

Яму зробіцца крыўдна і агідна. Ён рэзка крутанецца, выйдзе з двара на праспект, спыніць машыну і паедзе дахаты. Там будзе пуста, неабжыта. Назаўтра ваўкалак паляціць на самалёце на сваю новую радзіму. Яго будзе чакаць сям’я, віктарыянскі дом і ружовая гартэнзія ў заднім дворыку.

Дыванок з мішкам застанецца ляжаць там, дзе і раней. Яна без зразумелай для сястры прычыны забароніць той выкідаць яго. Потым яна будзе прыязджаць да сястры гады ў рады і сама здзіўляцца, нашто тая трымае перад новымі жалезнымі дзвярыма гэткае рыззё. А гэная гісторыя... Яна заўжды будзе ведаць, пад адным яны зараз небам ці не. І гэтае адчуванне — усё, што ёй застанецца ад былога.

## 2.

Ён будзе чакаць дылера ля паштамта. Прыстойны малады чалавек: ці то офісны планктон, ці то сам сабе начальнік. У строгім дарагім касцюме, з нейкім дурацкім кейсам, ён будзе пачувацца як груган на азяродах. Да прыпынку падкоціцца машына, уключыцца аварыйка. Нервы крыху адпусцяць: прыехаў — можна супакоіцца, заплаціць за сваё дабро і знікнуць. Нечакана з аўтамабіля выскачыць неверагодна прыгожая дзяўчына, кінецца змяёй яму на шыю, пацалуе ў вусны. Ён ашалее, абдыме яе за плечы, крыху адхіне ад сябе, прыгледзіцца. Ейная сяброўка! Шыкоўная, бясстрашная, недасяжная, заўжды радая паддражніць. Яна засмяецца, развернецца, скокне, бы тая котка, на пасажырскае сядзенне, і машына газане прэч. Усё, здаецца, адбудзецца за некалькі секундаў.

Ён будзе стаяць узрушаны, але пры гэтым як абліты памыямі: увесь прыпынак аблезлага люду будзе тарэшчыцца на яго. Знайшоў жа ён месца! Падвярнулася ж гэтая! Што за горад! Выпаўзеш на цэнтр — толькі што нябожчыкаў знаёмых не сустрэнеш. Немагчыма травы спакойна купіць. Стой цяпер, як дурань. Хай цябе цэнтравыя цёткі разглядаюць — яны хоць і лічаць сябе надта гарадскімі, але маральнае асуджэнне ў іх вачах адрозніваецца ад мікраараённага толькі на пару градусаў. І нават маладая дзяўчына, на выгляд, прасунутая, будзе разглядаць яго з такім непадробным здзекам і грэблівасцю.

Ваўкалак ледзьве не прысядзе: інстынктыўна захоча схавацца, зліцца з асфальтам, казюркай запаўзці за калону. Такога проста не бывае, каб у адзін момант трапіліся абедзве гэныя дзяўчыны. Гэта ж *яна*. Яна насмешліва падыме падбароддзе, схіліць набок галаву з непаўторнымі рудымі кучарамі — маўляў, як жа ты цяпер будзеш выкручвацца, свае паводзіны тлумачыць. І яшчэ гэты ідыёцкі касцюм і кейс! Ён спужаецца, што яна будзе лічыць яго безаблічным япі! Высокая, зграбная, у элегантнай зялёнай сукенцы, што струменіць каля прыгожых ног. Свецкая ільвіца, якой непатрэбная машына, бо яна жыве і тусуецца на пары квадратных кіламетраў у сэрцы горада.

Ён не падыдзе. Гэты офісны касцюм і дурацкі кейс... Да таго ж праз якую хвіліну падруліць з падземнага пераходу дылер. Нейкі схілены набок, з даўгім носам, дзіцячай кніжачкай у кішэні курткі. Трэба будзе хутка і беспамылкова зрабіць справу: грошы — тавар. Тады ўжо не да першага кахання. Пакуль ён будзе калупацца з кейсам, дылера некуды знясе неабавязковым травеньскім ветрам. Пад’едзе аўтобус — адзін, другі. Ён заўважыць у заднім акне толькі чужыя твары, поўныя вясновых надзеяў наступіць на старыя граблі. Яна з’едзе.

Ён пойдзе ў двары, сядзе ў машыну, паторкаецца па вузкіх дарожках. Хвілін праз пятнаццаць прыедзе дахаты. Адчыніць новае «шклопакетнае» акно на старой кухні, падыхае выхлапамі, дзіцячымі крыкамі. Паглядзіць з вышыні на гэткіх жа, як і сам, мэтаскіраваных хлопчыкаў на «жалезных конях». Правядзе рукой па прыробленым да стала дзедавым такарным станку. Пацешыцца сваімі кар’ернымі дасягненнямі — прагматыст з напаўкрымінальнымі захапленнямі. Зачыніць акно. Запаліць самакрутку. Дасць вачам адпачыць на кудлатай лістоце паверхам ніжэй. Зноў узгадае яе.

Ваўкалак яе нічым не пакрыўдзіў. Усяго толькі на ейны дзень народзінаў выпаўз ноччу з яе найлепшай сяброўкай прагуляцца па праспекце. Было свежавата, чыста, яны ўзялі з сабой па кубачку гарбаты. Гэткая дробязь, а перавярнула ўсё жыццё. Бязвінны жарт, кураж, які скончыўся нічым для ўсіх траіх.

Ноччу ваўкалак будзе добра спаць. Прысніць яе ў мужчынскім манаскім строі з капюшонам на галаве. Са схаванымі валасамі ейны твар будзе іншым — спакойным, таварыскім, пазбаўленым жарснасці. Ён запытаецца: «Нашто я тады за ёй пайшоў? Чаму ты тады засталася?» Яна паціsне плячыма і ўсміхнецца. У наступны момант ён убачыць яе за шклом у аграмадным аўтобусе. Яна будзе есці заварное піроЖнае і задуменна ў нешта ўглядацца. Калі яна падыме да галавы руку, каб зняць капюшон, ён ад жаху прачнецца.

## 3.

У аграгарадку пакінуць недаробленымі гарышчы. Хто захоча, дабудуе сабе другі паверх. Жонка будзе настойваць, каб ён змайстраваў хаця б прыстойную лесвіцу, калі не жадае рабіць мансарду. На гарышчы можна захоўваць яблыкі, сушыць зёлкі, пакінуць вопратку старэйшых дзяцей, пакуль падрастуць малодшыя. Ён адмовіцца. Разбурчыцца: «Пастаўлю сабе там ложак і буду ўцякаць ад вас. Ты са сваёй вагой мяне ўжо дакладна не дастанеш».

Ваўкалак будзе хавацца на гарышчы, паліць пад жончына крыклівае абурэнне і ўспамінаць *яе*. Звычайныя летнія вакацыі, паездкі на рэчку на роварах, дзіцячыя анекдоты на ганку ля нежылой хаты. Начныя вылазкі ў суседскія грушы разам з гаспадаровымі ўнукамі. Як яна студэнткай здала на правы і вазіла іх футбольную каманду на гульню ў суседнюю вёску. Яны прайгравалі і супернікі смяяліся: «Трэба было сваіх гульцоў перад машынай пускаць. Хай бы беглі ды трэніраваліся! Можа б, тады і выйгравалі!»

Ён адправіцца да маці ў родную вёску, каб пабачыцца з пляменнікам, якога адпусцяць з арміі ў адпачынак. Вып’е. Выйдзе ўвечары прагуляцца. Ногі самі прывядуць да яе хаты. Будзе гарэць святло, гуляць дзіця. Ваўкалак зайдзецца ў дварышча, ціхенька пашкрабецца ў засуненыя дзверы, але ніхто не адчыніць. Не пачуюць? Не захочуць яго пусціць?

Назаўтра днём ён, ужо добра п’яны, выйдзе на праменад да бабак. Сустрэне пасярод вёскі яе. Яна будзе ўсё такой самай жанчынай-падлеткам, хоць у яе, нарэшце, народзіцца дачка. Летам заставацца ў горадзе будзе проста немагчымым: французскія вокны ў шыкоўнай новай кватэры дрэнна стасуюцца з патрэбамі малога дзіцяці. Яна рызыкне і прывязе дачку ў вёску.

Малая пацягнецца да яго, але потым на рукі не пойдзе. Ваўкалаку зробіцца прыкра. Каб схаваць няёмкасць, ён спытаецца:

— А бацька твой ці прыедзе?

— Не. А што, справа якая? — адкажа яна.

— Не. Так, пытаюся: даўно не бачыў.

У яго моцна зменіцца праз паленне голас, пасівеюць валасы, выпадуць пярэднія зубы. Ён пачне расказваць бабкам пра свае добрыя заробкі, сучасны дом з усімі выгодамі, пра тое, што старэйшая дачка мусіць паступаць налета. А яна будзе адыходзіцца з вазком усё далей, бо малая заплача — запатрабуе есці.

Дома, пакарміўшы і пераадзеўшы дзіця, яна падумае, што трэба будзе параней засунуцца: у Мікалайкавых гуляюць — яшчэ прыцягнуцца, каб разам выпіць і паразмаўляць. Добра, што ў большасці вяскоўцаў ёсць прымхі альбо сумленне: адны баяцца навесці сурокі, другія — нанесці бацылаў, таму ніхто асабліва ў хату не шчэміцца. Файна, што хутка скончыцца лета, і можна будзе з лёгкім сэрцам і пачуццём выкананага абавязку ўцячы ў горад. Сядзець у бетоннай вежы, гуляць у парку і ведаць, што ніякі мужык нападпітку не будзе дыхаць пад дзвярыма і барабаніць у ганку ў акенца. Як добра, што ўсе жыхары дома пагадзіліся пасадзіць у пад’ездзе кансьержку!

## 4.

На сераду яму паставяць адну пару зранку. Гэта яго цалкам задаволіць. Ён вернецца з лецішча ў аўторак вечарам. Перадасць унука бацькам, а сам разгрузіць і ўпарадкуе гародніну, памыецца набранай загадзя ў вёдры вадой і пачне рыхтавацца да заняткаў. Назаўтра ўстане а шостай, каб паснедаць у цішы, на самоце, і, папіваючы каву, пачытаць кніжку для душы. А сёмай ён уцячэ з хаты, каб не ўкрыпацца ў працэс абуджэння вялікай сям’і, і пешшу пойдзе ва ўніверсітэт.

У сераду ранкам горад апануе пяшчотная смуга. Ваўкалак будзе пачувацца, як пасля лазні на свежым паветры. Кат*ы* ўжо даўно будуць шаравацца па сваіх пільных справах. Людзі, яшчэ прыязныя пасля летняга адпачынку, пакіруюць да прыпынкаў, павядуць малых у дзіцячыя сады. Гандляры на Кракаўскім кірмашы пацягнуць да ятак вазкі з перавязанымі шпагатам скрынкамі.

Ваўкалак любіць восень. Гэта пачатак настаўніцкага года, новыя знаёмствы, новыя стасункі, новыя кнігі. У верасні прыемна прысесці на лавачку перад універам, з’есці позні яблык з лецішча. Адчуваць спіной парк цераз плошчу, разглядаць маладых дзяўчат, прыслухоўвацца да іхніх поўных надзей размоваў. Ваўкалак і сам гатовы скінуць старую зашмальцаваную скуру, забыцца на статус любімага бацькі і дзеда і перанесціся на трыццаць гадоў назад.

Ён быў тады маладым выкладчыкам, пасля аспірантуры. Праца ў Львоўскім універсітэце была марай ягонага жыцця, і, здавалася, што ўсе астатнія спадзевы гэтак жа мусяць збыцца, дзякуючы патрэбным намаганням і пэўнай удачлівасці. Ён быў гатовы прыняць свой шчаслівы лёс, і сэрца ягонае было накшталт цёплай, нагрэтай ліпеньскім сонцам азёрнай роўнядзі.

Дзяўчына гэная вялікай чорнай птушкай спусцілася на водную паверхню і годна разрэзала папалам ягонае жыццё. З персідскімі вачыма, густымі цёмнымі валасамі, пышнай фігурай, гэтак папулярнай у шасцідзесятыя гады, яна растурбавала ягоныя дні і ночы. Горад, і без таго казачны, расквеціўся яскравымі фарбамі. Колеры пульсавалі, згубілі мяккасць. Хацелася заплюшчыць вочы, каб не забыцца дыхаць, бо ўсяго гэтага было зашмат.

Ваўкалак быў яе выкладчыкам нямецкай. Ён, здаецца, страціў мову і родную, і замежную — запінаўся, блытаў словы, мяняў тэму ўрока. Насмешніца, ганарыстая жартаўніца, дзяўчына кпіла з ягоных пачуццяў, дурэла з апантанасцю дзіцяці. Гэныя некалькі гадоў, што ваўкалак мусіў весці ў яе заняткі, былі для яго самымі салодкімі і самымі горкімі ў жыцці.

Нарэшце, яна скончыла вучобу, пайшла працаваць інжынерам на завод. Жыла, як і ўсе, у адноснай нэндзы. Купляла праз чыгуначную правадніцу масла ў Мінску, чакала кватэру ад прадпрыемства. Спадзявалася толькі на сябе: бацька загінуў на фронце, маці настаўнічала на радзіме, у Горках. Прыгажуня-сястра загібалася за садыстам-мужыком.

Ваўкалаку пасля ейнага выпуску палепшала. Зрабілася лягчэй дыхаць. На працы ён пачаў выпраўляць сваю нягеглую рэпутацыю мямлі і вар’ята. Ажаніўся з нармальнай западэнскай украінкай. Тыповыя вясельныя фоткі: мажная маладая, худзенькі-здыхленькі жаніх. Пайшлі дзеці, нарадзіўся ўнук. Адпусціла...

...У гэную сераду ваўкалак з палёгкай скончыць сваю ранішнюю пару. Як заўжды задумаецца, ці не пайсці яму папрацаваць у бібліятэку. Павагаецца і вырашыць лепей пагуляць з унукам. Праз парк, праз Кракаўскі кірмаш рушыць дахаты. Яна гэным днём запозніцца: будзе ўсё нешта корпацца ў сваёй аднапакаёўцы, прыбіраць «дзіцячыя пасцелькі». Потым схамянецца і кінецца на кірмаш купляць катам вымя. Да Кракаўскага — тры хвіліны ходу, але яна ўсё адно будзе хваляваецца, што які-небудзь злыдзень яе апярэдзіць. Яна пакульгае з калком па бруку, ганячы «вуйкоў» за вялікія і малыя грахі: вуліцы не мятуць, смецце не вывозяць, катоў памыйных крыўдзяць, а ёй іх падбірай, лячы, выкормлівай.

Яна не зверне на гэнага прыстойнага дзядзечку ніякай ўвагі: будзе апантаная страхам, што «дзеткі» пакрыўдзяцца на яе, бо не зварыла ім своечасова паесці. Ваўкалак жа летуценна міне кульгавую цётухну, бо паглыбіцца ў чароўныя ўспаміны пра сваё старое каханне, якое жыве ў двары насупраць Кракаўскага. Ён і ходзіць гэнай дарогай не зусім дзеля таго, каб купіць унуку пакамечанага вінаграду, а каб спаткаць яе — прыгожую, жартаўлівую, фігурыстую. Але не дай Бог гэным дваім сустрэцца. Хай яны жывуць у сваіх мроях і не-не ды ўзгадваюць такую нядаўнюю маладосць.

*Ліпень—кастрычнік 2009*




## КАНЦЭРТЫ

**Святы вечар з гуртом Guda за Бараўлянамі**

**7 студзеня а 19-й** гурт Guda запрашае на Святы вечар. Вас чакае куцця, сустрэча з незвычайнымі гасцямі, што нясуць кожнаму шчасце і дабрабыт, калядныя гульні і варажба... Як даехаць: з Дружнай (чыгуначны вакзал), пл.Незалежнасці, Якуба Коласа аўтобус-экспрэс № 515 і маршрутка «Бараўляны». Ад ст. м. «Маскоўская» (пр. на вул. Валгаградскай) — усе тыя ж, а таксама аўтобусы № 9, 113. Праезд да прыпынку «Шпіталь». Ад прыпынку крыху наперад па ходу аўтобуса — цагляны 9-павярховік, **д.34, кв.34**. Вуліца ніяк не называецца — проста **пасёлак Лясны.** Мецьпры сабе 15 тысяч рублёў, каб было што кінуць калядоўшчыкам у торбу.

**На Каляды**

**9 студзеня а 16-й у Музычнай гасцёўні «Дома Ваньковічаў» (вул. Інтэрнацыянальная, 33а)** — вечар санат «На Каляды». Будуць гучаць творы Гендэля, Моцарта, Гайдна, Грыга.

**Дзецідзяцей**

**10 студзеня а 19-й у малой зале к/з «Мінск»** выступіць гурт «Дзецідзяцей» з рок-княжзёўнай Ганнай Хітрык.

## ІМПРЭЗА

**Прэзентацыя новага літаратурнага часопіса**

**7 студзеня ў Чырвоным касцёле** — вечарына-прэзентацыя першага нумара новага літаратурна-мастацкага часопіса «Верасень». У імпрэзе бяруць удзел: Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дайнека, Алег Трусаў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Віталь Рыжкоў, Таццяна Беланогая. Вядучы вечарыны — паэт і бард Эдуард Акулін. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Калядны фэст**

**У Палацы мастацтваў да 7 студзеня** працуе мастацкая выстава «Калядны фэст». На ёй прадстаўленыя творы прафесійных мастакоў, а таксама студэнтаў Акадэміі мастацтваў. Гэта і жывапіс, і графіка, і скульптура, і выцінанкі, і шмат іншага.

**Малабюджэтны рай**

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а)** адкрылася калектыўная выстава «Малабюджэтны рай». «Малабюджэтны рай» — гульня з прадметамі мінулага, эксперымент, спроба візуалізаваць памяць пра колішнія адчуванні са свята Новага года — таго самага, калі «неба было больш блакітнае». На выставе аўтары запрашаюць папрактыкавацца ў віншавальна-пажадальным літаратурным напісанні, усталяваўшы ля ўваходу ў выстаўную прастору тры стэнды «для творчага запаўнення». Выстава будзе працаваць **да 13 студзеня 2010 года.**

**Шчодры куфар**

**У Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20) да 26 студзеня** працуе выстава «Шчодры куфар», на якой дэманструецца мастацтва пляцення з саломкі, роспісу і інкрустацыі куфраў саломкай.

**Калядная зорка**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (пл. Кастрычніцкая, 1) да 15 студзеня** працуе выстава «Калядная зорка», дзе прадстаўленыя творы розных відаў дэкаратыўна-выяўленчага мастацтва, аб'яднаныя тэмай Каляд.

## ТЭАТРЫ

**6 студзеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**7 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды алавянага жаўнерыка, пастушкі і камінара»

**8 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Востраў Сахалін»

**9 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

**10 студзеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Тэатр лялек** — «Чароўная лямпа Аладзіна»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**11 студзеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»

**12 студзеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»

**13 студзеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»

**14 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Стваральніца цуду»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дзённік паэта»

**15 студзеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Тэатр оперы і балета** — «Карміна Бурана. Кармэн-сюіта»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»

**16 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**17 студзеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Тэатр оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Тэатр імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

## КІНААФІША

# Такога Холмса вы яшчэ не бачылі




**Шэрлак Холмс** (Sherlock Holmes)
ЗША — Вялікабрытанія — Аўстралія, 2009, каляровы, 128 хв.
**Рэжысёр:** Гай Рычы
**Жанр:** Комікс-гатычны дэтэктыў паводле сцэнару Майкла Роберта Джонсана, Энтані Пэкхама, Саймана Кінберга паводле персанажаў Конана Дойла
**Адзнака:** 7,5 (з 10)

Шэрлак Холмс на экране бываў розным. Быў класічны лонданскі дэтэктыў з задуменным тварам Васіля Ліванава. І быў недарэка, за якога працаваў Ватсан. Быў Шэрлак Холмс худы і тоўсты. І была нават Шэрлі Холмс — жанчына. Але героя, якога прапанаваў нам рэжысёр Гай Рычы, свет нават не ўяўляў.

Новы Холмс у выкананні Роберта Даўні — карацiст і забіяка са звычкамі Тэрмінатара і агента 007. Ён круціць амуры і сігае ў Тэмзу з акна. Не саступае залiхвацкаму Холмсу і доктар Ватсан (Джуд Лоу). Дэтэктыўна-гангстэрская парачка разносіць Лондан (і злачынны свет) ушчэнт.

Сюжэт — Холмс і Ватсан арыштоўваюць небяспечнага лорда Блэквуда. Але пасля павешання сатаніст не памёр. Ён тэрарызуе горад і плануе захапіць уладу ў Брытанскай імперыі. Сябрыдэтэктывы ідуць па следзе.

Новыя прыгоды не маюць нічога супольнага з канантычнымі гісторыямі пра Шэрлака Холмса.

Затое ёсць Бейкер-стрыт і зляканая прыгодамі місіс Хадсан.

Ёсць нязменная скрыпка і люлька.

І ёсць слынны дэдуктыўны метад, перад якім бяссільныя самыя акультныя змовы.

# «Ты мусіш падняцца!»

**Чорная маланка** (Чёрная молния)
Расія, 2009, каляровы
**Рэжысёр:** Аляксандр Вайцінскі, Дзмітры Кісялёў
**Ролі выконваюць:** Грыгорый Дабрынін, Кацярына Вілкава, Віктар Вяржбіцкі, Сяргей Гармаш, Валерый Залатухін, Іван Жыткоў, Кацярына Васільева, Міхаіл Яфрэмаў, Юозас Будрайціс
**Жанр:** расійскі комікс пра супермэна
**Адзнака:** 5 (з 10)




Скванпы нягоднік марыць прасвідраваць пліту, на якой стаіць Масква, каб дарвацца да алмазаў. Для гэтага яму неабходна машына з нанарухавіком. І менавіта такая машына — у выглядзе дапатопнай «Волгі» — трапляе ў рукі галоўнаму герою. Небагаты студэнт Дзіма, закаханы ў мясцовую прыгажуню, падпрацоўвае развозам кветак. Па сумяшчальніцтве яму прыйдзецца стаць супермэнам.

Праца ў Галівудзе пайшла прадусару Бекмамбетаву на карысць. Цяпер у ягоным фільме ёсць людзі (няхай і аднамерныя) — і ёсць сюжэт, а не бязладны набор статусных кліпаў. Навязліва-рэкламныя ды «всталосколенные» моманты амаль незаўважныя. Хаця ветліва падкрэсліваецца, што «Волга» — машына Пуціна, а галоўныя разборкі адбываюцца на Краснай плошчы.

Натужліва ўсміхаецца гераіня, зззяюць чырвоныя зоркі. «Ты мусіш падняцца! Ты мусіш падняцца!» — заклікае расійскі патрыятычны слоган.

Толькі кіроўца — не супермэн, а «Волга» — не бэтмамабіль.

**Андрэй Расінскі**

# У Мінску — Пэн

Падобны збор экспануецца ў сталіцы ўпершыню.



**Юдаль Пэн. Аголеная жанчына.**

У Гістарычным музеі (Маркса, 12) праходзіць выстава карцін Юдаля Пэна. Выстава прымеркаваная да 155-годдзя з дня нараджэння мастака. На ёй выстаўленыя 33 працы са збораў Віцебскага краязнаўчага музея. У Мінску яны экспануюцца ўпершыню.

Гэта пейзажы, эцюды, партрэты. Менавіта ў партрэце мастак змог найбольш яскрава выразіць сваё майстэрства. Пэн здолеў аднолькава ўдала перадаць характар як арыстакраткі на палатне «Дама з муфтай», так і стварыць вобраз сумнага «Старога палкоўніка з мундзірам».

Юдаль Пэн вядомы тым, што ў беларускім мастацтве распаўсюдзіў яўрэйскія матывы. Сярод ягоных вучняў былі Марк Шагал і Заір Азгур.

Выстава працуе да 31 студзеня.

# Горы: ад Сілічаў да Наваградка

**Сёлетняя зіма радуе вялікім снегам. Самы час выбрацца на выходныя пракаціцца з ветрыкам.**

Жыхары Мінска, якія не маюць часу выехаць за горад, але не могуць сабе адмовіць у задавальненні з'ехаць колькі разоў з гары, могуць наведацца ў Курасоўшчыну, дзе нядаўна адчыніўся гарналыжны цэнтр «Сонечная даліна».

Непадалёк ад сталіцы працуюць гарналыжны цэнтр «Сілічы», парк актыўнага адпачынку «Якуцкія горы», алімпійскі спартыўны комплекс «Раўбічы». Актыўны адпачынак можна сумясціць з культурнай праграмай — вандроўкай у старажытны Наваградак, у ваколіцах якога дзейнічае вядомы ў краіне біятлонны цэнтр.

Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы» (Лагойскі раён) прапануе 7 лыжных трасаў і асноўную гару. Вышыня схілаў — больш за 100 м. Дзейнічае коўзанка. Цана аднадзённага тура, які ўключае трохразовае харчаванне, пражыванне і карыстанне абсталяваннем гарналыжнай трасы — ад 253 500 рублёў. Рэжым працы: панядзелак — чацвер з 12.00 да 22.00, пятніца — 12.00—23.00, субота — 10.00—23.00, начныя катанні — 23.00—02.00, нядзеля — 10.00—22.00.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Калі не сваім аўтамабілем, то даехаць можна грамадскім транспартам ад аўтавазала «Маскоўскі».

Алімпійскі спартыўны комплекс «Раўбічы» месціцца за 35 км ад Мінска. Прапануе лыжныя трасы павышанай складанасці, акрабатычны схіл для фрыстайла, лыжаролерную трасу. Пражыванне ў нумарах комплексу каштуе ад 32 000 рублёў. Праезд ад аўтавазала «Маскоўскі».

Парк актыўнага адпачынку «Якуцкія горы» знаходзіцца побач з Дзяржынскам за 37 км ад сталіцы. Тут можна пакатацца на горных лыжах з невысокай гары, сноўбордзе, снегаходах, квадрацыклах.

У будні парк працуе — 12.00—21.00, на выходных — 10.00—2.00.

Біятлонны цэнтр пад Наваградкам знаходзіцца на пад'ездзе да горада з карэліцкага накірунку. Адлегласць ад Мінска — каля 140 км.

**Сямён Печанко**

СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

# Медыкі абвяргаюць міф аб бясшкоднасці кальяна

**Курэнне кальяна шкоднае для здароўя не менш за паленне цыгарэтаў.**

Гэта даказалі навукоўцы Універсітэта штата Вірджынія (ЗША) і Амерыканскага ўніверсітэта ў Бейруце (Ліван).

Згодна з вынікамі іх даследавання, дым ад кальяна змяшчае такія ж хімікаты, як і цыгарэтны. Ён павышае рызыку сардэчнасасудзістай дысфункцыі і развіцця нікатынавай залежнасці.

На працягу двух гадоў дактары назіралі за здароўем курыльшчыкаў кальяна ў Ліване ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў. Кожны добраахвотнік распальваў тытунь і пры дапамозе кальяна, і ў цыгарэтах. Вылічаліся ўзровень нікатыну і вокісу вугляроду, таксама фіксавалася частата сэрцабіцця.



Даследаванні паказалі, што доза вокісаў вугляроду, якія атрымлівае арганізм, пры паленні кальяна ў тры разы вышэйшыя, чым пры паленні цыгарэт. Пікавыя ж узроўні нікатыну аказаліся аднолькавымі як для кальяна, так і для цыгарэтаў. Аналізуючы колькасць і аб'ём кожнай зацяжкі падчас палення кальяна, удыханне дыму было ў 48 разоў вышэйшым у параўнанні з цыгарэтамі. Акрамя таго, тытунёвы дым ад кальяна ўтрымлівае ракатворныя злучэнні.

За апошнія гады папулярнасць кальяна рэзка вырасла, асабліва сярод моладзі. Большасць юнакоў пэўныя, што кальянавы дым утрымлівае меней смолаў і нікаціну, чым тытунь. Як бачым, гэта не так.

**Настасся Шамрэй**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Юшка са сцерлядзі посная

**1,25 кг дробнай рыбы, 1,25—1,5 кг вялікай рыбы, 10—12 зярнят англійскага перцу, 1 шклянка мадэры, 2—3 лаўровыя лісты, 2 морквы, 1 пятрушка, 1 сельдэрэй, 1 парэй, 1—2 цыбулі, 1 лімон.**

Прыгатаваць булён з рознай дробнай рыбы, найлепш з яршоў, працадзіць праз сурвэтку, выдушыўшы колькі мажліва гушчы. Палажыць у яго нарэзаную кавалкамі і прысоленую сцерлядзь, зварыць, здымаючы пену. Лімон нарэзаць колцамі, пакласці ў супніцу і заліць кіпячым супам, у які можна ўліць шклянку мадэры або іншага моцнага віна.

Таксама выдатны суп атрымліваецца з ласося або асятра.

З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858 пераклала НБ

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншуем Змітра і Таццяну Бартосікаў** з нараджэннем чацвёртага малога, сына. Хай расце здаровым на радасць бацькам!

**КНІГІ**

**Прадам** «Беларускую энцыклапедыю» ў 18 т. (камплектам ці па тамах). Т.: 298-16-62.

Прадам Тлумачальны слоўнік расійскай мовы Уладзіміра Даля ў 4 т. Т.: (0777) 74-56-67, (29) 305-17-12.

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 24 студзеня 2010 г. па маршруце: Мінск — Княжыцы — Вейна — Дашкаўка — Магілёў — Мінск. Кантакты: (029) 622-57-20, (029) 110-19-28, (029) 509-12-16, (017) 292-54-58.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ЗДАРОЎЕ

## Цяпер барадаўкі выводзяць лазерам

**Лячэнне барадавак сокам дзьмухаўцоў — учорашні дзень.**

Хто з нас не ведае пра барадаўкі — калі не з уласнага досведу (пашчасціла ж!), дык на прыкладзе кагосьці з родных ці знаёмых. Адкуль яны бяруцца? Навукова пацверджана, што барадаўкі часцей з'яўляюцца ў нервовых асобаў. Барадаўкі — гэта новаўтварэнні на скуры. Сучасная медыцына прапануе некалькі метадаў эфектыўнага выводзення барадавак: радыёхвалевую хірургію, крыятэрапію (уздзеянне вадкім азотам), электракаагуляцыю (выдаленне барадавак з дапамогай электрычнага току), хімітэрапію, уздзеянне лазерам.

Тыя ж, хто не давярае медыкам або не мае на тое сродкаў, могуць скарыстацца адным з дзедаўскіх спосабаў: намазваць барадаўкі сокам дзьмухаўцоў ці часнаку, рабіць кампрэсы з кому зваранай ў лупінах бульбы і г.д. Але пры гэтым памятайце: перш чым узяцца за барадаўкі, неабходна параіцца з лекарам! Самалячэнне можа прывесці да з'яўлення злаякасных новаўтварэнняў.

**Сямён Печанко**

РЭБУС

**Дапішы адну літару, каб атрымалася новае слова**

| | |
|---|---|
| Рыс | Мель |
| Трава | Пень |
| Слон | Рот |
| Вага | Мара |
| Мова | Свая |
| Мара | Рак |

Адказы глядзі на старонцы 16.

## Газетка дзеткам





Едзе мышка далінаю

Маркоўнаю машынаю.

Пакуль у горад дапаўзе —

усю машыну пагрызе.







Плакат Уладзіміра Цэслера.




Паштоўка skepsys.livejournal.com




Паштоўка кампаніі «Будзьма».




Паштоўка кампаніі «Будзьма».

## АНЕКДОТЫ

* * *

Здам фотаапарат у рамонт — раніцай 1 студзеня ён перастаў факусавацца на тварах.

* * *

Гіпатэнуза — яна, вядома, карацейшая, але звычайна праз гурбы снегу...

* * *

— Чаго сумная такая?
— Ледзь не сарвала дзіцяці ранішнік.
— Як?
— Напярэдадні пазваніла выхавацелька, папрасіла, каб усе бацькі былі ў масках...
— І што? Яны ж у кожнай аптэцы прадаюцца.
— Вось усе такія разумныя былі! Адна я прыйшла ў масцы кракадзіла!

* * *

Даішнік спыняе машыну. Выходзіць адтуль круты мэн:
— Прабач, братан. Што я парушыў?
— Вы здзейснілі небяспечны манеўр і падрэзалі іншы транспартны сродак. З вас штраф 100 000 рублёў.
— Слухай. Адкуль ты ведаеш? Гэта было дзесяць кіламетраў адсюль?!
— Дык вы ж дагэтуль між цягачом і прыцэпам едзеце!

* * *

— Дарагі, цяпер, як сумленны чалавек, ты проста абавязаны ўзяць мяне замуж!
— Але між намі ж яшчэ нічога не было!
— Так, але ты ўжо бачыў мяне без макіяжу!

## НН 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Камета.** У 1910 годзе з'явіцца на небе камета. Забабонныя людзі кажуць, што камета з'яўляецца толькі перад якім-небудзь няшчасцем, а ёсць і такія, каторыя думаюць, быццам камета наляціць на зямлю і наступіць канец свету.

Што станецца, калі камета спаткаецца з зямлёй? Зямля пройдзе скрозь каметы, як куля праз хмару пылу, і ніхто на зямлі гэтага не ўбачыць. Толькі ў ясную ночку будзем назіраць падаючыя зоркі — гэта будуць згараць у паветры каменьчыкі, якія складаюць камету.

**НН. №1. 1910**

**Пуцін.** Рэйтынг Пуціна ў Расіі стабільна перавышае 60%. У Пуціну Расія знайшла страчанае на пачатку ельцынскіх рэформаў адзінства. Мужчыны бачаць у ім свайго знаёмага Вову-шпэндзіка, жанчыны — непітушчую, надзейную падпору.

Некаторыя лічаць, што Пуцін можа стаць жорсткім дыктатарам, з паталагічнымі схільнасцямі, ставячы ў прыклад вайну ў Чачэніі на вынішчэнне. Іншыя, наадварот, звяртаюць увагу на тое, што Пуцін — фігура не харызматычная, што карысна для фармавання дэмакратычнай свядомасці.

У Пуціну няма нічога містычнага. Ён — прэзідэнт-функцыя, функцыя ад тых сілаў, якія цяпер маюць уплыў у Расіі з улікам патрабаванняў крайне шавіністычнага і мілітарызаванага расійскага грамадства.

Што датычыць Лукашэнкі, дык яму на 8 гадоў можна развітацца з марамі пра расійскі трон.

**НН. №1. 2000**

## ТРЭБА ДАПАМОГА



Маленькаму Эдуарду крыху больш за год. Дыягназ — дзіцячы цэрэбральны параліч і эпілепсія, 4-я дзіцячая група інваліднасці. За гэты час бацькі выдаткавалі болей, чым зарабілі, і таму звяртаюцца па дапамогу да Вас. Грошы неабходныя для лячэння ў ЗША — у Інстытуце развіцця чалавечага патэнцыяла Глена Домана (г. Філадэльфія).

Дабрачынныя рахункі адкрыты ў філіяле №514, г. Мінск, вул. Сурганава, 47а, УНП 100420097, МФО 153001614

Беларускія рублі — транзітны рахунак 3819382102369 на дабрачынны рахунак 000000008 у філіяле №514

Еўра — транзітны рахунак 3819382109779 на дабрачынны рахунак 9780000000018 у філіяле №514

Долары ЗША — транзітны рахунак 3819382109779 на дабрачынны рахунак 8400000000112 у філіяле №514

Расійскія рублі — транзітны рахунак 3819382109779 на дабрачынны рахунак 6430000000009 у філіяле №514

Прызначэнне плацяжа: на Дубінку Вольгу Вячаславаўну для лячэння сына Эдуарда Паўлавіча.

**Адказы на рэбус са старонкі 15.** Рысь, Страва, Услон, Увага, Умова, Хмара, Чмель, Шпень, Крот, Шрот, Хмара, Сваяк, Грак

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6300. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 04.01.2010.
Замова № 34.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
M 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 10001